Пролетарыи всех стран, соединяйтесь! פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער פאַראייניקט זיך! Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się! Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

УМОВЫ ПАДПІСКІ:
На 1 м-ц—90 к.; на 3 м-цы—2 р. 60 к. на 6 м-цаў—5 р.; на 1 год—9 р. 75 к.
Змена адрасу: мясцовага—10 к., іншагароднага—20 кап.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:
За радок пошпарэлі (пасьля тэксту)—50 кап. Для Масквы і Ленінграда—1 р. Пасярод тэксту у два разы даражэй.
Пры шматразовым друкаваньні—скідка на 3годнe.
Згодна пост. СНК ад 10 верасьня 1924 г. бярэцца зьверх тарыфу 10 проц. падатку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца: У Гал. Канторы газ. „Зьвязда"—г. Менск, Савецкая 63, трэці паверх, ад 9 гадз. раніцы да 3-х гадз. дня. У акруговых гарадох—у аддз. Бел. Дзярж. Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах,
РЭДАКЦЫЯ—Г. МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63.

ЗВЯЗДА

Орган Цэнтральн. Камітэту камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Мен. АК КП(б)Б.

РЭДАКЦЫЯ і ГАЛОЎН. КАНТОРА.
1) Редактар прыме ад 11—1 гадз. дня: тэлефон № 10-74. 2) Сакратар рэдакцыі—ад 12 да 2-ое гадзіны дня, тэл. № 6-19. 3) Начны рэдактар (друкарня) ад 6 гадз. вес. тэл. № 6-42
Кіраўн. Гал. Канторай Канторы абвестак і падпіскі } тэл. № 781.

СУБОТА, 14 СТУДЗЕНЯ 1928 г.
№ 12 (2819)
Кошт асобнага нумару ўсюды 5 кап.
Год выданьня дванаццаты.

За выразнасьць работы.

Перажываемыя часы, у сувязі з затрудненьнямі на паасобных вучастках нашай гаспадаркі, патрабуюць асаблівай выразнасьці і гібкасьці ў працы ўсіх нашых апаратаў, усіх органаў і ўстаноў і, у першую чаргу,—гаспадарчых.

Гэтыя затрудненьні, у прыватнасьці, недавыкананьне па пляне хлебазагатовак і загатовак сырцу, якраз у вельмі значнай ступені і тлумачацца іменна гэтай нявыразнасьцю і нягібкасьцю ў працы нашых апаратаў. Бюракратызм разьядае апараты і ў выніку прыводзіць да затрудненьняў у тэй ці іншай галіне нашай будаўнічай працы.

Учора на старонках «Зьвязды» народны камісар гандлю, ў гутарцы з нашым супрацоўнікам, адзначаў вялясьць работы нашых загатоўчых арганізацый.

Найбольш хлебны раён БССР—Случчына, як выяўляецца, патрабуе завозу хлебных прадуктаў, а ў Гомельскай, спажывецкай акрузе, у Хойніцкім раёне, каапэратыў за кроткі час загатовіў звыш 4.000 пуд. хлеба.

Чым вытлумачыць такое становішча?

Ды толькі тым, што «работа» слуцкіх загатоўшчыкаў у вялікай ступені хварэе на гэтую невыразнасьць і нягібкасьць.

Іншыя прыклады. Учора-ж, наша газэта паведамляла аб затрыманьні плацяжоў на с.-г. падатку на Лупалаўскім раёне ў Магілёўшчыне. Лупалаўскі раён—адзін з самых заможных раёнаў акругі і тым ня менш, там, да гэтага часу, унесена с.-г. падатку мала больш, чым палову таго, што належыць эа даны тэрмін. Выяўляецца, што члены некаторых сельсаветаў гэтага раёну падавалі насельніцтву прыклад... неплацяжу падатку.

Паступленьне плацяжоў па акладным страхаваньні на БССР таксама ідзе недапушчальна вяла. На 1-е студзеня павінна было паступіць ня менш 50 проц. усіх плацяжоў, а паступіла толькі 35 проц. Між тым, летась да гэтага-ж тэрміну было выканана 46,8 проц., г. зн. амаль па пляне. Бягучы-ж год у сэнсе забесьпячэньня насельніцтва сродкамі ўжо ніяк ня можа лічыцца горшым, як мінулы, наадварот, зараз сялянства мае куды больш вольных сродкаў, чым у мінулым годзе.

Справа, як відаць, і тут упіраецца ў работу нашых апаратаў.

Учора-ж мы паведамлялі аб плугох, якія тры гады марынаваліся пад адкрытым небам, у той час, як яны даўно павінны быць там дзе ім належыць быць—у вёсцы, у сялян.

Усе гэтыя факты патрабуюць да сябе пільнае ўвагі ўсяе партыі. Мы ня можам згаджацца з такім становішчам, калі выкананьне нашых гаспадарчых плянаў ставіцца пад пагрозу, дзякуючы нядбайнасьці і безадказнасьці паасобных нашых апаратаў, або аддзельных асоб з гэтых апаратаў.

Партыйныя арганізацыі і ўсе члены КП(б)Б **павінны гаспадарчыя пытаньні паставіць начале сваёй работы.** Тады мы можам у час прыкмячаць тое, што перашкаджае нашай рабоце і ў час і бязьлітасна гэтыя моманты зьнішчаць.

Крыніцы сродкаў для індустрыялізацыі.

(Да пастаноў XV зьезду УсеКП(б)).

Адзінай крыніцаю сродкаў, як вядома, зьяўляецца праца; неабраны яблык з дзікай яблыні не зьяўляецца каштоўнасьцю, таксама, як і вада што ня прынесена з рэчкі. Толькі ў вытворчасьці ствараюцца новыя багацьці, правільней, новыя каштоўнасьці. Толькі рабочыя, сяляне, саматужнікі і рамесьнікі зьяўляюцца іх творцамі.

Ніхто, зразумела, не сумняваецца ў тым, што прадукцыйнасьць працы рабочага буйной прамысловасьці ў шмат разоў вышэй прадукцыйнасьці працы сялян, саматужнікаў і рамесьнікаў. І таму няма нічога дзіўнога, што галоўная доля сродкаў на індустрыялізацыю здабываецца ў самой прамысловасьці.

Паводле пяцігадовага пляну ВСНГ СССР, які быў нядаўна апублікаваны, відаць, што дзяржпрамысловасьць у працягу пяці год, пачынаючы з бягучага году, адкладзе 2,9 мільярд. руб. у якасьці амартызацыйных і будзе мець 4,8 мільярдаў руб. чыстага прыбытку, з якой сумы ў прыбытак казны будзе ўзята 2,5 мільярд. руб.

Апрача таго, за той-жа пэрыяд часу плянуемая дзяржпрамысловасьць атрымае 1 мільярд руб. у выглядзе банкаўскага кароткатэрміновага крэдыту, а таксама каля 4-х мільярдаў руб. у якасьці датацый, доўгатэрміновага фінансаваньня і замежных крэдытаў.

Прымаючы пад увагу тое, што казна дае прамысловасьці часткова тыя сродкі, якія былі ўзяты ад яе-ж самой, мы павінны канстатаваць, што **асноўнай крыніцаю капітальных укладаньняў у прамысловасьць зьяўляецца сама-ж прамысловасьць.** Таму выдатнае і рашаючае значэньне мае тэмп росту прадукцыйнасьці працы ў індустрыі,—які залежыць ад рацыяналізацыі гаспадарчых, асабліва прамысловых, працэсаў. «Увядзеньне новай тэхнікі, паленшаньне арганізацыі працы, узьняцьце кваліфікацыі рабочай сілы і, пры зьмяншэньні працоўнага дня, пры большай яго нагрузцы,—такія галоўныя складаныя часткі працэсу рацыяналізацыі»—кажа XV зьезд партыі па дакладу т. Рыкава.

Паданыя вышэй лічбы паказваюць, аднак, ня толькі на тое, што крыніцы прамысловага будаўніцтва знаходзяцца пераважна ў самой індустрыі, але і аб значнасьці сродкаў, якія атрымліваюцца з боку ў выглядзе крэдытаў і датацый. Справа ў тым, што дадатковы прадукт ствараецца выключна ў працэсе вытворчасьці але разьмяркоўваецца ён у працэсе звароту. Чым больш дадатковага прадукту асядае, напрыклад, у гандлі, тым менш ён удзельнічае ў пашыраным аднаўленьні вытворчасьці. XV партызезд патрабуе максымальнай рацыяналізацыі гандлю: «Інтарэсы разьвіцьця вытвараючых сіл краіны патрабуюць такога разьмеркаваньня сродкаў, пры якім па магчымасьці большая частка іх укладалася-б у вытворчасьць і магчыма меншая асядала-б у тавараправодзячай сетцы». «Паскарэньне звароту ў гандлі, побач са зьніжэньнем накладных выдаткаў і загружаньнем работы кожнай гандлёвай адзінкі, спрашчэньне, скарачэньне і выпрастаньне тавараправодзячых шляхоў зьяўляюцца асноўнымі мэтадамі вырашэньня гэтае задачы».

XV-ты партызезд гаворыць і аб **трэцяй істотнай крыніцы—аб зьбераженьнях у насельніцтва.** Нават мізэрныя зьбераженьні, сабраныя дзесяткамі мільёнаў людзей, становяцца вялізнай сумаю. Касы ашчаднасьці, з аднаго боку, крэдытная сыстэма, з другога, унутраныя пазыкі, з трэцяга—вось арганізацыйныя формы мабілізацыі дробных і драбнейшых зьбераженьняў. Пазыка індустрыялізацыі прайшла дасканала. Трэба дабіваца поўнай рэалізацыі сялянскай пазыкі.

Індустрыялізацыя азначае ня толькі рост прамысловасьці, але і разгортваньне працаёмкіх культур у вёсцы, лепшае, больш шырокае абслугоўваньне сельскаю гаспадаркаю індустрыі. У даным выпадку рашаючую ролю адыграе каапэрацыя. Яна павінна прыцягваць як мага больш прыватных сродкаў у выглядзе паявых узносаў, удзельнічаць разам з дзяржорганамі ў справе рацыяналізацыі сельскае гаспадаркі і г. д.

Ні адна з крыніц індустрыялізацыі не павінна выходзіць за межы нашае пільнае ўвагі. Усе яны павінны быць выкарыстаны.

В. С.

Італія рэгулярна дастаўляе Вэнгрыі зброю.

Прызнаньне вэнгерскага шпіёна.

ПРАГА, 12. Чэха-славацкае тэлеграфнае агэнцтва паведамляе:

«Вэнгерская газэта „А Рэгель", якая выдаецца ў Браціславе, агалосіла прызнаньне, зробленае рэдактару газэты нейкім Ласло, які ў бягучы час знаходзіцца ў зьняволеньні ў брацісла́ўскім астрозе па абвінавачаньні ў шпіянажы на карысьць Вэнгрыі. Ласло, які прызнаў сябе прафесыянальным шпіёнам, заявіў, што тры гады таму назад Італія адправіла ў Румынію цэлы транспарт зброі, намечанае ў чыгуначных дакументах грузам „гародніны". Гэты транспарт «абгуляў» у Вэнгрыі. Каля Мэзэ (Вэнгрыя) у бутрох, што ідуць уздоўж шашы, вырыты пячуры, у якіх схаваны 4 бранявікі. На вэрфях у Будапэшце схаваны рачны крэйсэр, які знаходзіцца там пад выглядам буксірнага судна. На артылерыйскім палігоне ў горадзе Хайманскеры схавана вялікая колькасьць паенных прылад і стрэльб. У ваколіцах Сэгледы ў сялянскіх хатах схаваны кулямёты.

У свой час, міжсаюзьніцкая ваенная кантрольная камісія паведала гэтую мясцовасьць, але нічога не знайшла, бо сяляне, згодна атрыманага імі распараджэньня, перанесьлі кулямёты ў іншае месца».

Канфэрэнцыя прадстаўнікоў генсавету і прадпрыемцаў.

Поўнае адзінства паміж лідэрамі прафсаюзаў і ангельскімі капіталістымі.

ЛЁНДАН, 12. Сёньня ўвечары адбылося першае аб'яднанае пасяджэньне ангельскага генэральнага савету трэдюньёнаў у поўным складзе і групы прамыслоўцаў, начале якой стаіць Альфрэд Монд. Пасяджэньне было прысьвечана пытаньню аб супрацоўніцтве рабочых з прадпрыемцамі ў прамысловасьці. Старшыня пасяджэньня Монд у сваёй прамове падкрэсьліў, што задачаю канфэрэнцыі зьяўляецца вывучэньне праблемы, якая стаіць перад ангельскай прамысловасьцю, а не перагаворы паміж прадстаўнікамі рабочых і прадпрыемцаў.

У адказе Монду ад імя генэральнага савету Бэн Тэрнэр настойваў на тым, што аб'яднаныя пасяджэньні прадстаўнікоў генэральнага савету з прадпрыемцамі не павінны зрабіцца арэнаю для дыскусій, а павінны ўяўляць сабою «сур'ёзнае збліжэньне, якое мае на мэце захаваць нацыянальную прамысловасьць і знайсьці шляхі і спосабы для зьнішчэньня цяперашняга прамысловага хаосу».

Першым у спрэчках выступіў Кук, які пратэставаў супроць усяго характару пасяджэньня. З тэй прычыны, што на пасяджэньні прысутнічала каля 60 чалавек, была ўнесена прапанова перадаць далейшае абгаварэньне высунутых пытаньняў камісіям, якія павінны быць назначаны кожным з бакоў. Монд заявіў, што прадпрыемцы ўжо назначылі сваю камісію. Бэн Тэрнэр зазначыў, што генэральны савет яшчэ не ўхваліў пастановы аб складзе сваёй камісіі і назначыў апошнюю па чарговым надзвычайным пасяджэньні савету. Па сканчэньні пасяджэньня Кук у гутарцы з карэспандэнтам ТАСС заявіў, што „пасяджэньне было фарсам спачатку да канца".

* * *

ЛЁНДАН, 12. Сакратар агульнаангельскае федэрацыі горнарабочых Кук заявіў на сканчэньні канфэрэнцыі аб „міры ў прамысловасьці", што яна была „сапраўднаю камэдыяй". У часе канфэрэнцыі іншыя члены генсавету востра нападалі на Кука. Наадварот, старшыня генсавету Бэн Тэрнэр заявіў, што канфэрэнцыя была «вельмі ўдалаю».

* * *

Сэр Альфрэд Монд зьяўляецца адным з галоўных натхніцеляў руху за „мір у прамысловасьці" і гэта ня выпадкова. Альфрэд Монд зьяўляецца прадстаўніком усіх тых галін прамысловасьці, якія расьцьвілі пышнаю кветкаю пасьля вайны і яскрава выдзяляюцца на фоне агульнага ўпадку ангельскае гаспадаркі. Сюды адносяцца хэмічная прамысловасьць, выраб штучнага шоўку і электрычная прамысловасьць. Ва ўсіх гэтых галінах Монд займае адно з першых месц. Зусім зразумела, што гэтыя галіны прамысловасьці зацікаўлены ў прамысловым міру, у адсутнасьці забастовак і ўзьняцьці вытворчасьці без канфлікта з рабочымі. Гэтыя галіны прамысловасьці гатовы нават паабяцаць некаторыя ўступкі рабочым. Лідэры генэральнага савету трэд-юньёнаў поўнасьцю становяцца на бок капіталістых і думаюць толькі аб тым, якім чынам больш бяспалёзна прынусіць прафсаюзы „супрацоўнічаць" з прадпрыемцамі ў справе „рацыяналізацыі і эканомікі". Гарантыі, якіх яны дабіваюцца, супадаюць з абяцанкамі сэра Альфрэда Монда. Заўчасна можна прадбачыць, што гэтыя абяцанкі будуць парушаны пры першым-жа пагоршаньні справу паноў Монда і К-о. Такім чынам, хаенгнута поўнае аднадушша паміж верхавінкаю прафсаюзаў і прадпрыемцаў.

„Нявольніцкі мір не прапягнецца доўга",—так казалі ангельскія гарнякі пасьля паражэньня забастоўкі. Гэтыя словы прыстасоўны і да апошняй выдумкі паноў Монда, Сітрына (сакратар генэральнага савету) і К-о.

Французская рэакцыя наступае.

Парлямант выдаў суду камуністычных дэпутатаў.

КАШЭН І КУТУР'Е АРЫШТАВАНЫ.

ПАРЫЖ, 12. Французская палата дэпутатаў большасьцю 310 галасоў супроць 227 адхіліла рэзалюцыю сацыялістычнай фракцыі, якая патрабуе захаваньня дэпутацкае недатыкальнасьці за камуністычнымі дэпутатамі, прысуджанымі да турэмнага зьняволеньня.

т. КАШЭН.

ПАРЫЖ, 12. Пры абгаворы ў палаце дэпутатаў паданае сацыялістымі другое рэзалюцыі, згодна якое асуджаныя камуністычныя дэпутаты непавінны быць арыштаваны да сканчэньня парляманцкае сэсіі, урад паставіў пытаньне аб даверы.

Рэзалюцыя адхілена большасьцю ў 298 чал., супроць 229.

* * *

ПАРЫЖ, 12. Агэнцтва «Гавас» паведамляе, што камуністычныя дэпутаты Вайян Кутур'е і Кашэн арыштаваны пры выхадзе з будынку палаты дэпутатаў.

т. ВАЙЯН КУТУР'Е.

Да перагляду справы Макса Гельца.

БЭРЛІН, 12. На мінулым тыдні абаронцы вядомага нямецкага рэвалюцыянэра Макса Гельца разам з прадстаўнікамі нямецкай камуністычнай партыі і нямецкай сэкцыі МОПР'у наведалі Гельца ў Зоненбургскай катаржнай турме. Абаронцы запрапанавалі Гельцу падаць хадайніцтва аб новым разглядзе справы. У выніку гутаркі ён рашыў падаць такое хадайніцтва ў Вярхоўны суд яшчэ ў працягу студзеня. Паводле вестак „Ротэ Фанэ", па справе Гельца ўдалося здабыць новыя важныя даныя, якія сьведчаць аб неабходнасьці перагляду вынесенага прыгавору.

НАС ПРОСЯЦЬ ПАВЕДАМІЦЬ.

Да справы з плугамі.

У сувязі з зьмешчаным ва ўчарашнім нумары нашай газэты матар'ялам аб плугах, якія ўжо 3 гады валяюцца на станцыі Менск МББ чыг. пад сьнегам і дажджом, Менская акруговая пракуратура просіць нас паведаміць, што ёю ўтворана спэцыяльная камісія для расьсьледваньня ўсіх абставін гэтае справы.

У Зах. Беларусі.

ПАНСКАЕ „ПРАВАСУДЗЬДЗЕ".

ВІЛЬНЯ, 12. Віленскі акруговы суд засудзіў на 4 гады да катаржнага астрогу б. грамадаўца Янку Балаша, абвінавачанага па арт. 126 Кр. К. (пры належнасьці да нелегальнае арганізацыі) у антыўрадавых выступленьнях у Дзісьненшчыне.

Балаш абскардзіў справу перад апэляцыйным судом. Абаронца Балаша даведзіў, што арт. 126 да яго ня можа быць прыстасаваны, бо „злачынствы" Балаша зроблены ім у часе легальнасьці «Грамады». Апэляцыйны суд згадзіўся з абаронцам, аднак...прысуд пакінуў у моцы, ня зьменшыўшы кары.

„Шыбенізацыя" на „крэсах".

ВІЛЬНЯ, 12. Газэты паведамляюць, што паводле новага распараджэньня, усе судовыя прыгаворы па кару сьмерці будуць выконвацца праз павешаньне.

У сувязі з гэтым у Беластоцкім астрозе пабудавана першая шыбеніца. У першых лічбах студзеня будзе выканана першае павешаньне—бандыта У. Станкевіча.

Кат Беларускае Грамады.



Мы чуем вас, браты!

Стогне Беларусь Заходняя,
Там зьдзек над целам і душой.
Браткі! Старонка Усходняя
Сочыць за вашай барацьбой!

Янка Кашкель.

ПА САВЕЦКІМ САЮЗЕ.

Хлебазагатоўкі—узмацненьне хлебных адгрузак.

ХАРКАЎ, 12. Як паведамілі карэспандэнты Ратау «Вукасьпілны», дзякуючы раду мерапрыемстваў па ўзмацненьні хлебных адгрузак, першая 10-дзёўка студзеня дала ў гэтых адносінах рэзкі пералом. У той час, як, згодна плянаваному заданьню, „Вукасьпілка" павінна была за гэты пэрыяд адгрузіць на ўсеукраінскія рынкі (на Поўнач, Закаўказьзе і Сярэднюю Азію) 464 вагоны рознага збожжа, фактычная адгрузка за 10 дзён складае 708 вагонаў. Дзякуючы павялічэньню адгрузак, «Вукасьпілка» поўнасьцю ліквідавала за справаздачны пэрыяд сваю недагрузку хлеба ў Закаўказьзе і Сярэднюю Азію.

* * *

СТАЛІНГРАД, 12. У апошнія дні прыкмячаецца ажыўленьне хлебазагатовак. Загатоўкі павялічыліся в 4.526 цэнтнэраў у першую пяцідзёўку да 6108 цэнтнэраў у другую пяцідзёўку студзеня.

Арышты спэкулянтаў.

РАСТОЎ-ДОН, 12. У Майкопе арыштавана 11 чалавек за спэкуляцыю таварамі і хлебам.

За рад скажэньняў у працы аддана пад суд праўленьне Беларэцкага с.-г. таварыства.

Прэміі за выканьне пляну.

АРЦЁМАЎСК, 12. За пасьпяховае выкананьне хлебазагатоўчага пляну Райсаюз выдаў прэмію Сьвятагорскаму раённаму спажывецкаму таварыству. Аднаму з яго пайшчыкаў у працягу наступнай курортнай кампаніі будзе прадастаўлена месца ў Адэскай санаторыі. Апрача таго, старшыні 7 таварыстваў атрымаюць грашовую ўзнагароду за выкананьні заданьняў па хлебазагатоўках.

Сходы сялян ухваляюць дэкрэт ураду аб самаабкладаньні

АРЦЁМАЎСК, 12. У 17 сёлах Канстантынаўскага раёну, пашыраныя пасяджэньні сельсаветаў, разам з сельскім актывам, аднагалосна ўхваляюць рэзалюцыі аб самаабкладаньні ў разьмеры 25—30 проц. адзінага сельска-гаспадарчага падатку па культурным і гаспадарчым патрабам сёл. Рэзалюцыі агульных сходаў усіх сёл Арцёмаўскага і раду сёл Славянскага раёну, цалком ухваляюць дэкрэт ураду аб самаабкладаньні. Сходы выказваюцца за набудову новых школ, медыцынскіх і ветэрынарных пунктаў на сяле.

Рэалізацыя паэлькі ўмацаваньня сялянскае гаспадаркі.

АРОЛ, 12. Пачалася падрыхтоўчая праца па рэалізацыі пазыкі ўмацаваньня сялянскае гаспадаркі. Для правядзеньня ўсяе падрыхтоўчае працы па распаўсюджаньні пазыкі на месцы адпраўлена 40 адказных працаўнікоў, якія ўжо распачалі працу.

40 вагонаў сельска-гаспадарчых машын тры месяцы стаяць на рэйках. Вінаватых—да адказнасьці.

АДЭСА, 12. Прадстаўнікі РСІ, якія выехалі ў Бярозаўку ў зьвязку з выкрыцьцём прастою 40 вагонаў з сельска-гаспадарчымі машынамі і прамтаварамі на чыгуцы, паведамляюць:

„Гэта партыя тавараў, якая складаецца з плугоў, сеялак, веялак і прамысловых тавараў была адасланa ў адрас Краснапольскага, Бярозаўскага, Ісаеўскага, Вормскага і іншых сельска-гаспадарчых каапэратываў для продажы сялянству. Аднак, усе тавары ляжалі нявыгружанымі яшчэ з кастрычніка. За прастой вагонаў каапэратывам прышлося заплаціць 800 руб. штрафу. Пракуратура УРСІ прыцягвае вінаватых да адказнасьці.

„Дальрис" заказвае трактары ў Амэрыцы, а Харкаўскі завод не нагружаны. Умяшаньне РСІ.

ХАРКАЎ, 12. НК РСІ Украіны зьвярнуўся ў Саюзны НК РСІ з просьбаю праверыць правільнасьць апошніх у украінскіх газэтах вестак аб выдачы «Дальрису» органамі Наркамгандлю, наперакор пастановам Савету Працы і Абароны, ліцэнзій на права заказу трактараў у Амэрыцы.

У выпадку пацьвярджэньня гэтых вестак НК РСІ УССР просіць прыцягнуць вінаватых да адказнасьці.

НК РСІ УССР катэгарычна настойвае на перадачы поўнасьцю заказаў далёкаўсходніх арганізацый на мощны вусенічныя трактары харкаўскаму заводу, трактары якога слаба загружан і на поўнай забароне закупкі гэтых трактараў за граніцаю.

Забесьпячэньне вёскі таварамі.

МАСКВА, 11. Загад вышэйшага савету народнай гаспадарчі СССР аб узмацненьні разгортваньня прамысловай вытворчасьці ў другім квартале бягучага гаспадарчага году спаткаў жывы водгук ва ўсіх вытворчых арганізацыях і прадпрыемствах.

Рад трэстаў ужо ўступіў на шлях практычнага ажыцьцяўленьня дырэктыў ВСНГ. Так, Гуматрэст прыймае ўсе меры для павялічэньня ў другім квартале выпрацоўкі галёш да 10-ці мільёнаў пар супроць 9,4, згодна праграме. Цэнтральны шкляны трэст дасьць рост вытворчасьці паўбелага шкла на 15,1 проц. больш, чым у першым квартале. Жаршвэймашына павяліча выпрацоўку машын на 5.000 шт. звыш праграмы.

Пашыраецца і вытворчасьць саматужнай прамысловасьці. Так, напрыклад, саматужна-прамысловая каапэрацыя краіны прадугледжвае на працягу бліжэйшых двух месяцаў выпусьціць прадукцыю на 12 мільёнаў руб. супроць 8 мільёнаў, якія прадугледжаны ў першапачатковым пляне на ўвесь квартал.

НАЧНОЕ РАДЫЁ

Бандыцкі налёт фашыстых на савецкую выстаўку ў Брусэлі.

ПАРЫЖ, 12. Каля 2 гадзін дня, у момант адчыненьня савецкае выстаўкі ў Брусэлі, група членаў бэльгійскага фашысцкага саюзу моладзі зрабіла налёт на памяшканьне выстаўкі. Узброеныя дубінкамі, яны разьбілі і парвалі ўсё, што маглі, у тым ліку бюст Леніна, плякаты, малюнкі. Усё гэта рабілася пад водгукі: „Далоў Саветы"! і цягнулася ня больш 2 хвілін. Пасьля, па сьвістку старшага, яны ўцяклі, раздаючы антысавецкія праклямацыі.

УВАГА: Гутарка ідзе аб выстаўцы-перасоўцы савецкага культурнага і гаспадарчага будаўніцтва, наладжанай т-вам культсувязі з заграніцаю пры дапамозе бэльгійскага т-ва прыяцеляў СССР.

ПАРЫЖ, 13. Агэнцтва „Гавас" з Брусэлю паведамляе, што сьледчая ўлада не магла знайсьці ніякіх адзнак, якія дапамаглі-б выявіць налётчыкаў.

Кітайскія навіны.

ШАНХАЙ, 13. У вёсках уздоўж Шанхай—Ханьчжоускай чыгункі і на граніцы правінцый Цьзянсу і Чжэцьзян адбываюцца камуністычныя паўстаньні. У гэты раён паслана войска.

ПЕКІН, 13. Атрад сялянскае арганізацыі „Вялікія нажы" ў 600 чалавек адабраў зброю ў паліцыі і варты гандлёвае палаты ў павеце Дунхуа. Каля гораду Дунхуа адбываецца бойка між атрадам і двума батальёнамі мукдэнскае арміі.

ТОКІЁ, 13. Каб перашкодзіць наступу мукдэнцаў, Чан Кай-шы загадаў згрупаваць войска на поўначы правінцыі Хэнань. Апроч таго, Чан Кай-шы перадаў Фын Юй-сяну 1 млн. долараў для арганізацыі супраціву мукдэнцам.

Вызваленьне каманды параходу „Памяць Леніна".

ПЕКІН, 13. Сёньня вызвалена з астрогу каманда савецкага параходу „Памяць Леніна". Каманда выехала ў Дайрэн, а адтуль выедзе ва Уладзівасток.

За аднаўленьне англа-расійскага камітэту.

ЛЁНДАН, 13. Рад арганізацый, якія далучаюцца да лёнданскае рады прафсаюзаў, патрабаваў аднаўленьня англа-расійскага камітэту. Лёнданская рада прафсаюзаў учора на пасяджэньні прапанавала выканкому выпрацаваць рэзалюцыю і падаць яе на зацьвярджэньне пленуму рады, што адбудзецца ў лютым. Сакратар лёнданскае рады прафсаюзаў падкрэсьлівае, што рэзалюцыя, як відно, вынікацца за аднаўленьне камітэту.

Новы латвійскі ўрад.

РЫГА, 12. Пасьля трохтыднёвых перамоў аб стварэньні кааліцыі складаўся новы латвійскі ўрад з прадстаўнікоў партый цэнтру і правіцы.

Склад ўраду наступны: прэм'ер—Юрашэўскі (дэм. цэнтр), міністр замежных спраў—Сарыньш (правы аграры), унутраных спраў—Сейміус (аграры), фінансаў—Бокальдэр (дэм. цэнтр), сувязі—Гагнес (немец) і інш.

„ПАЛІЦЭЙСКІЯ САЦЫЯЛІСТЫЯ".

(Ад нашага пёнданскага карэспандэнта).

Посьпехі руху меншасьці ў ангельскіх прафсаюзах выводзяць з сябе прафсаюзных бюракратаў, якія ў апошні час пачалі зварачацца за дапамогаю да паліцыі для барацьбы з рабочымі.

У часе нядаўняга выступленьня Макдональда ў Порце, якое закончылася для яго вельмі няўдала, ангельскія рабочыя былі сьведкамі вельмі мілага саюзу паміж рэфармісцкімі лідэрамі і каралеўскай паліцыяй. Як вядома, партыя рабочыя пакідзілі сваёй прымовы, хутчэй удзячы пад аховаю 200 паліцэйскіх.

Ня менш пікантны выпадак, як паведамляе „Уоркер Лайф", адбыўся нядаўна ў Глазго. Глазгаўскія прафсаюзы ўжо даўно зьяўляюцца бяльмом на воку генэральнага савету. Рух меншасьці мае ў гэтай акрузе шмат прыхільнікаў, які, на гледзячы на шматлікія „чысткі" усё расьце. У час нядаўніх дадатковых муніцыпальных выбараў, мясцовая арганізацыя рабочае партыі, улічваючы рост сымпатый рабочых да камуністых, высунула кандыдатам камуністага Эткена Фэргюсона. Гэтага бюракраты з глазгаўскага савету прафсаюзаў не змаглі перанесьці. Прэзыдыум савету запрапанаваў глазгаўскай арганізацыі рабочай партыі зараз-жа выключыць Фэргюсона і яго аднадумцаў з партыі. Калі гэта спроба не ўдалася і глазгаўскія „лейбурыстыя" далікатна, але цьвёрда адказалі прэзыдыуму, што Фэргюсон выключан ня будзе, прэзыдыум парашыў ужыць іншыя меры. На першай-жа канфэрэнцыі савету старшыня запрапанаваў Фэргюсону і яго 10 таварышам пакінуць залю пасяджэньня. Фэргюсон адмовіўся і старшыня адазваў канфэрэнцыю. Усьлед за гэтым пачаліся выключэньні з партыі цэлых арганізацый і жорсткая кампанія супроць Фэргюсона. Мясцовым арганізацыям быў пасланы цыркуляр, які прапанаваў замяніць мясцовых членаў савету «дэлегатамі, якія абараняюць пункт гледжаньня нацыянальнага выканаўчага камітэту рабочае партыі». Савет выбіраўся пасьля гэтага два разы і кожны раз з адноўкавымі вынікамі. Мясцовыя арганізацыі паўтарна пасылалі на пасяджэньні сваіх старых прадстаўнікоў і старшыня савету быў прымушан абодвы разы адкладваць пасяджэньне.

У трэці раз былі ўжыты экстраординарныя меры. На пасяджэньне была запрошана паліцыя, якая павінна была забраць непажаданых прэзыдыуму дэлегатаў. Як толькі дэлегаты прабраліся праз кардон паліцэйскіх, якія праверялі ля ўваходу дэлегацкія паўнамоцтвы, заля папоўнілася крыкамі абурэньня. Старшыня савету, член незалежнае рабочае партыі Скалан захацеў паказаць „цьвёрдую руку" і запрапанаваў паліцыі арыштаваць першага, што пападзецца на вочы—дэлегата Ліндана. Ліндэн быў зараз-жа адведзен у паліцэйскую ўправу, дзе яму было прад'яўлена абвінавачаньне ў парушэньні грамадзкага парадку, у спробе сарваць пасяджэньне і г. д.

Тым часам у савеце выбухла бура. На адрасе членаў прэзыдыуму савету раздаваліся галасы: „Ганьба", „паліцэйскія сацыялістыя" і г. д. Пры нясьцыпным шуме, сход пастанавіў ужыць меры да вываленьня Ліндана з-над варты. Сход запрапанаваў таксама прэзыдыуму савета адмовіцца і падалей ад паслуг паліцыі. З тэй прычыны, што ніхто з прысутных не хацеў узяць на сябе місію праверкі дэлегацкіх мандатаў, пасяджэньне савету было адкладзена ў трэці раз.

ПОЛЬШЧА НЯСПЫНЯЕ ІНТРЫГ СУПРОЦЬ ЛІТВЫ.

НАПАДЫ ПОЛЬСКІХ САЛДАТ НА ЛІТОЎСКІХ ЖЫХАРОЎ.

КОЎНА, 10. Літоўскія палітычныя колы пэсымістычна ацэньваюць пэрспэктывы польска-літоўскіх перагавораў. Афіцыяльныя літоўскія паведамленьні адзначаюць, што за апошні час зноў мелі месца напады польскіх атрадаў на мірных жыхароў літоўскіх вёсак, якія знаходзяцца пры дэмаркацыйнай лініі. Польскі ўрад падтрымлівае інтрыгі літоўскіх эмігрантаў у Вільні. З 43 зачыненых у Вілекскай обласьці літоўскіх школ, ні адна зноў не адчынена, а з 10 арыштаваных там літоўскіх ксандзоў вызвалены толькі двое.

С.-д. Плечкайціс—агэнт охранкі.

КОЎНА, 10. Орган кіруючай партыі „Летувос" агалашае паведамленьне аб тым, што сацыял-дэмакрат Плечкайціс, адзін з арганізатараў новага «паходу на Літву», у 1922 і 23 годзе, будучы дэпутатам літоўскага сойму, служыў за грошы ў контр-разьведцы. Паводле слоў „Летувос", Плечкайцісу было даручана дастаўляць весткі аб дзейнасьці сацыял-дэмакратаў і камуністых.

Зачыненьне камітэту народнікаў-сялян.

ВІЛЬНЯ, 10. „Кур'ер Віленскі" паведамляе з Коўны, што ўрад Вальдэмараса прапанаваў адпаведным органам улады ліквідаваць камітэты народнікаў-сялян. Арыштавана 100 чалавек, праведзена шмат вобыскаў. Арышты і вобыскі, паводле чутак, праводзяцца ў зьвязку з тым, што партыя народнікаў-сялян пайшла да згоды з сацыял-дэмакратамі і хоча вярнуць урад Вальдэмараса.

Перад выбарамі ў польскі сойм.

Заяводы абмяркоўваюць як ашукаць масы на выбарах.

ВАРШАВА, 11. Учора ў міністэрстве ўнутраных спраў адчыніўся зьезд ваявод пад старшыньствам міністра Складкоўскага і пры ўдзеле віцэ-прэм'ера Бартэля і дырэктара палітычнага дэпартаменту Сьвітальскага. На зьезьдзе пры сутнічаюць 16 ваявод і ўрадавы комісар Варшавы. Зьезд ваявод прысьвечан розным пытаньням бягучага жыцьця Польшчы, у тым ліку, выбарам у сойм і сэнат.

„УНДА" І БЛЁК МЕНШАСЬЦЯЙ.

ВАРШАВА, 12. „Глос Праўды" паведамляе, што цэнтральны камітэт украінскай народна-дэмакратычнай партыі „УНДА" настаніў не далучацца да блёку меншасьцяй і выступіць у Галіцыі з уласным сьпісам. У адказ на гэта блёк нацменшасьцяй прыгразіў, што па ўсюды выключыць украінцаў з блёку, калі не далучыцца „УНДА".

З мэтаю паразуменьня між блёкам і „УНДА" ў Львоў запрошаны прадстаўнікі блёку.

Яўрэйскія гандляры—у ролі служак Піпсудзкага.

ВАРШАВА, 12. Цэнтральны саюз яўрэйскіх купцоў, настаніў не далучацца да блёку нацменшасьцяй і выступіць з уласным сьпісам. Гэтымі днямі саюз выпусьціў адозву, у якой піша, што становішча яўрэйскіх купцоў пры Піпсудзкім палепшылася (?!).

Аднаўленьне польска-нямецкіх перагавораў аб гандлёвым дагаворы.

БЭРЛІН, 12. Як паведамляюць нямецкія газэты, сёньня ў Варшаве распачаліся польска-нямецкія перагаворы аб заключэньні гандлёвага дагавору. З нямецкага боку пэрспэктывы перагавораў ацэньваюцца спрыяюча, аднак, ёсьць думка, што перагаворы наўрад ці скончацца раней, як праз некалькі месяцаў. Мэтаю перагавораў зьяўляецца заключэньне, так званага, малога гандлёвага дагавору, які ахоплівае ня ўсю злучнасьць эканамічных узаемаадносін Польшчы і Нямеччыны, а толькі важнейшыя пытаньні.

ЖЫЦЬЦЁ ПАРТЫІ

ВЫВУЧЫМ ПАСТАНОВЫ XV ПАРТЗЬЕЗДУ.

(Менск, Гарадзкі раён).

Шырока разгарнулася ў партыйных ячэйках нашага раёну праграцоўка пастаноў XV-га зьезду УсеКП(б). На 20 ячэйках, дзе былі пастаўлены даклады аб выніках 15-га зьезду, прысутнічала 887 чалавек, ці 87 проц. партыйцаў гэтых ячэек.

На сходах, пры распрацоўцы, наглядалася вялікая актыўнасьць: 63 партыйцы выступалі ў спрэчках па дакладах, прысутнымі было зададана 113 пытаньняў.

З агульнага ліку заданых па дакладах пытаньняў—50—60 проц. былі чыста партыйнага характару.

— Чаму хоць і з дарадчым голасам дапусьцілі лідэраў апазыцыі на XV-ты зьезд—амаль на ўсіх сходах пытаюцца партыйцы.

У сваіх выступленьнях партыйцы патрабуюць поўнага ідэйвага і арганізацыйнага разбраеньня тых апазыцыянэраў, якія яшчэ засталіся ў радах партыі.

Партыйныя ячэйкі гарадзкога раёну цалкам ухваляюць ўсе пастановы 15-га зьезду. Галасавалі за пастановы зьезду аднагалосна, за выключэньнем аднаго толькі ўстрымаўшагася.

Некаторыя ячэйкі выносяць канкрэтныя прапановы аб парадку ажыцьцяўленьня пастаноў партыйнага зьезду ў межах сваіх ячэек. Ячэйкі прыступілі да глыбокага вывучэньня пастаноў зьезду, для чаго ствараюцца спэцыяльныя гурткі.

Па усіх ячэйках ужо прапрацавана пытаньне аб ідэалёгіі апазыцыі. На адкрытых сходах ячэек прапрацоўваецца даклад т. Бухарына. Частка ячэек прапрацавала даклад тав. Молатава аб працы на вёсцы.

М. З.

ЗА ПРАПРАЦОЎКАЙ ПАСТАНОЎ XI зьезду КП(б)Б і XV зьезду УсеКП(б)

(Кастрычнікавы раён, Менск).

Партарганізацыя прыступіла да прапрацоўкі пастаноў зьездаў з сярэдзіны сьнежня 1927 году. Частка парт'ячэек ужо правяла ітогавыя даклады аб XI-м зьезьдзе КП(б)Б, у другіх ячэйках толькі яшчэ абгаворвалася пытаньне аб нацыянальна-культурным будаўніцтве. Па ўсіх ячэйках праведзены ітогавыя даклады аб XV-м зьезьдзе УсеКП(б), на чарговых партдніёх спэцыяльна абгаворваюцца пытаньні аб міжнародным становішчы і пытаньні Камінтэрну, для большага вывучэньня гэтых пытаньняў у арганізацыі. У партыйных школах праведзены ітогавыя даклады аб 15-м зьезьдзе УсеКП(б), далейшая прапрацоўка будзе ўвязана з праходжэньнем праграм, прычым асноўная ўвага будзе завострана на пытаньнях зьезду.

Дакладамі аб выніках зьезду абхоплена пераважаючая большасьць арганізацыі, у некаторых ячэйках яўка была на 100 проц.

Асабліва шмат пытаньняў і выступленьняў было прысьвечана ўнутрыпартыйнаму становішчу: асноўная ўвага ў нас цяпер павінна пайсьці па лініі выпраўленьня недахопаў у рабоце, большай адказнасьці за яе і здаровай самакрытыкі,—зазначалі партыйцы.

Другая група большаю часткаю спынялася на недахопах гаспадарчай работы, на становішчы ў вёсцы, каапэрацыі і прапанавала вынішчыць недахопы на аснове пастаноў зьездаў. «Больш увагі якасьці прадукцыі, зьніжэньню сабекошту і пашырэньню, большае здавальненьне попыту на прамтавары, зьвішчэньню беспрацоўя, узмацненьню работы ў вёсцы, у прыватнасьці праз шэфскія арганізацыі, паляпшэньню масавай работы грамадзкіх арганізацый»—да гэтага зводзіліся іх прамовы.

Трэцяя група ў большай меры спынялася на пытаньнях культурнай рэвалюцыі і нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў Беларусі: «пытаньні культурнай работы—казалі яны—павінны заняць найважнейшае месца ў нашай рабоце, мы маем паслабленьне беларусізацыі, у прыватнасьці сярод актыву, трэба палепшыць абслугоўваньне нацменшасьцяй, большае вывучэньне пастаноў партыі па нацыянальным пытаньні і інш.».

Пры дыскусіі тэзісаў ЦК да зьезду частка таварышоў галасавала супроць і ўстрымлівалася, выяўляла хістаньні, пры ітогавых-жа дакладах аб 15-м зьезьдзе УсеКП(б) на ячэйках большасьць з іх адмежавалася ад поглядаў апазыцыі, прызнала свае памылкі і поўнасьцю далучылася да пастаноў зьезду.

У часткі-ж таварышоў хістаньні яшчэ канчаткова ня зжыты. Характэрныя іх выступленьні: «ад усяго адмяжоўваючыся і адмаўляючыся, я ня згодзен з выключэньнем лідэраў апазыцыі з партыі,—раз ёсьць пастанова, я падпарадкуюся, мне цяжка адмовіцца ад поглядаў, якія я ўчора выказваў».

Яшчэ адзін прыклад: таварыш не адмаўляецца ад падтрыманьня поглядаў апазыцыі, ячэйка ставіць пытаньне аб выключэньні яго з партыі за адрыў ад работы. У паданай заяве ён піша: «ад поглядаў не адмаўляюся, застаўляю за сабою права абараняць іх у рамках партыйнага статуту, пастановам зьезду падпарадкуюся і гэтак далей». Ячэйку такі адказ, зразумела, не здаволіў і ён выключан з партыі.

Больш глыбокая прапрацоўка пастаноў зьезда ў пачалася ў парт сэтцы і ў гурткох пры ячэйках. Для кіраўніцтва імі вылучаны найбольш падрыхтаваныя актывістыя.

На камсамольскіх ячэйках праводзяцца даклады аб выніках зьезду, пасьля чаго прапрацоўка будзе перанесена ў палітшколы і гурткі.

Сярод беспартыйных на сходах будуць пастаўлены даклады аб выніках 15-га зьезду, апроч таго намечана правядзеньне раду «вечароў пытаньняў і адказаў» аб зьезьдзе, у культурна-масавай працы больш увагі будзе зьвернута на высьвятленьне зьездаўскіх пытаньняў.

В. Капаевіч.

Прывітаньні ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б ад усебеларускага зьезду сялян-літоўцаў.

Першы ўсебеларускі зьезд сялян-літоўцаў, які на гэтых днёх скончыў сваю працу, паслаў прывітальныя тэлеграмы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б. У тэлеграме Цэнтральнаму Камітэту УсеКП(б) гаворыцца:

„Працоўныя літоўцы ў царскія часы знаходзіліся пад падвойным уціскам: эканамічным і нацыянальным. За простае навучаньне грамаце на роднай мове нас ссылалі на катаргу. Кастрычнікавая рэвалюцыя аддала нам землі, адкрыла школы, дала ўсе магчымасьці неабмежаванага і свабоднага разьвіцьця пад верным кіраўніцтвам пралетарыяту і яго партыі.

Мы спадзяемся, што ленінская партыя, кіруючы сацыялістычным будаўніцтвам, правільна будзе паказваць далейшыя шляхі і спосабы паляпшэньня нашага добрабыту.

Нехай жыве правадыр сацыялістычнага будаўніцтва—ЦК УсеКП(б)!"

У прывітальнай-жа тэлеграме ЦК КП(б)Б зьезд гаворыць:

Пры савецкай уладзе ўпяршыню мы атрымалі магчымасьць мець свае школы, чытальні і газэты. Мы пераконаны, што і ў далейшым пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, у цесным саюзе сялянства з рабочаю клясаю мы будзем, бяручы ўдзел і самі ў практычнай рабоце саветаў, паляпшаць сваю гаспадарку і ўзьнімаць сваю культуру. Мы пераконаны, што нашы браты і сёстры ў Літве, даведаўшыся аб росьце нашага гаспадарчага добрабыту і культуры ў сацыялістычным напрамку возьмуць з нас прыклад, скінуць сваіх фашыстых і пабудуюць савецкую рэспубліку.

Наладзім і гэту частку масавай працы.

(Слуцкі раён, Бабруйшчына).

Райгарамітэтам КП(б)Б распрацавана пытаньне аб становішчы працы на антырэлігійнай прапагандзе. Адзначана, што за апошні час гэта праца значна паслабла, з прычыны невыстарчальнай увагі гэтаму пытаньню з боку палітасьветных установаў і партарганізацыі. Агляданяся выпадкі, калі партячэйкі імкнуліся ўзяць на сябе цалком усю працу па правядзеньні антырэлігійнай прапаганды сярод насельніцтва, што таксама зьяўляецца значным недахопам. Зараз ячэйкам дадзена паказаньне аб тым, што ўся праца па антырэлігійнай прапагандзе павінна гуртавацца вакол хат-чытальнь, чырвоных куткоў і клюбаў.

Значнай перашкодай у правільнай пастаноўцы антырэлігійнай прапаганды зьяўляецца адсутнасьць у хатах-чытальнях і клюбах папулярнай антырэлігійнай літаратуры. Часопіс «Бязбожнік» распаўсюджваны падта слаба.

Прыступлена да арганізацыі таварыства «Бязбожнік» на тых прадпрыемствах, на якіх яно яшчэ не арганізавана.

У часе рэлігійных сьвят, пры ўдзеле гарадзкіх партыйцаў былі праведзены па саюзах вечары з пастаноўкай пытаньня «Сьвяты рэлігійныя і сьвяты пралетарскія». Гэтае пытаньне было таксама распрацавана на некаторых ячэйках ЛКСМ.

Я.

За партвучобай.

(Ячэйка КП(б)Б пры Наркампрацы, Менск).

Ня гледзячы на дрэнныя ўмовы, у якіх працуе наша ячэйка, аб'ядноўчы амаль што 8 установаў, у гэтым годзе мы маем рад посьпехаў у галіне пастаноўкі партыйнай вучобы сярод камуністых.

З усяго ліку ячэйкі 46 членаў і кандыдатаў партыі вучацца ў саўпартшколах, палітшколах, гурткох, вячэрнім рабочым унівэрсытэце і камвузе—31 чалавек. У вышэйшых партыйна-вучэбных установах навучаецца — 7 чалавек, у саўпартшколах—7 чалавек, а рэшта ў палітгурткох, што створаны пры ячэйцы.

Калі прыняць пад увагу, што з ліку ўсяе ячэйкі каля 10 чалавек камуністых такіх, якія па родзе свае працы заняты ў разьвезках, тады мы можам сказаць, што 95 проц. партыйцаў ахоплены тэй, ці іншай формай партыйнай асьветы. Трэба адзначыць і тое, што ёсьць у ячэйцы некалькі чалавек і такіх, якія зусім не ахоплены партвучобай, але бюро ячэйкі, разглядаючы гэта пытаньне, ухваліла прыняць належныя крокі да ўцягненьня гэтых таварышоў у існуючыя пры ячэйцы гурткі.

Тут неабходна спыніцца на працы гурткоў па вывучэньні ленінізму, які працуе пры ячэйцы. АПА камісія ячэйкі прыняла ўсе меры да таго, каб гэты гурток быў сэмінарам па пераапрацоўцы заданьняў нядзельнага камуністычнага унівэрсытэту. У гуртку займаецца нераважная большасьць тых камуністых, якія паведаюць нядзельны камвуз. Вопыт гэты ў поўнай меры сябе апраўдаў і гэта дапамагае таварышом у калектыўнай прапрацоўцы заданьняў унівэрсытэту.

Зараз АПА камісія ячэйкі прыступіла да падагульваньня вынікаў партвучобы камуністых за першую палову навучальнага году, выяўляючы праз гутаркі з кіраўнікамі і старастамі школ пасьпяховасьць таварышоў і ступень паведаньня імі заняткаў школ.

Дзямін.

У працы адставалі.

(Мазырская акруга).

При абмеркаваньні становішча работы Камарэвіцкай ячэйкі КП(б)Б Петрыкаўскага раёну, быў выяўлен рад недахопаў. Праўда, ячэйка на сваім складзе невялічкая (налічвае 4 члены і 2 кандыдаты), але на ўмовах сваёй працы яна змагла-б прарабіць значна больш, чым гэта яе было зроблена.

Калі прагледзець плянавасьць работы ячэйкі, дык можна ўбачыць, што з кастрычніка месяца да часу абсьледваньня, ячэйка працавала бяз плану і таму ня было сыстэмы ў кіраўніцтве ўсімі галінамі працы. Так, напрыклад, з матар'ялу абсьледваньня відаць, што дырэктыва даная ячэйкаю фракцыі сельсавету ў большасьці сваёй ня выкананы, камісіі пры сельсавеце, за выключэньнем зямельнай, не працуюць. За апошнія два месяцы, прэзыдыум сельсавету не праводзіў ніякіх пасяджэньняў. Група беднаты пры сельсавеце не разгарнула, як трэба, сваёй працы.

Ва ўнутрыпартыйнай працы ячэйкі ёсьць таксама рад недахопаў, галоўнымі з іх—гэта невыстарчальнасьць масавай працы і працы в бесэартыйным актывам. Слабасьць гэтай работы сьцьвярджае яшчэ і той факт, што ячэйка, абкаляючы сваім кіраўніцтвам савецкую гаспадарку, не змагла сярод рабочых паладзіць работу так, каб за іх кошт вырасьці. У апошнія часы, праўда, становішча трохі палепшылася: у ячэйку падана 11 заяў з боку сялян і рабочых калектыўнай гаспадаркі аб уступленьні ў партыю.

У кіраўніцтве працаю парт'ячэйка мала зьвяртала ўвагі на павялічэньне парт'ядра ў ячэйцы ЛКСМ. З гэтае прычыны ў камсамольскай ячэйцы ёсьць выпадкі п'янства, „бузацёрства" і іншых пездаровых зьявішч.

Да дасягненьняў ячэйкі трэба аднесьці, добрае кіраўніцтва працай каапэратыву, які за апошнія часы ўзмацніў работу і эканамічнае становішча каапэратыву, каапэравана 755 чалавек. Амаль што поўнасьцю каапэравана беднота, на што скарыстаны ўвесь фонд, прызначаны для гэтай мэты.

Б. Шпітальнік.

Аб дапусьцімасьці для членаў партыі атрымліваць выйгрышы па аблігацыях дзяржаўных пазык.

Унутраныя пазыкі, касы ашчаднасьці і інш. формы дзяржаўнай фінансавай палітыкі дапамагаюць савецкай дзяржаве дробным індывідуальным зьберажэньні сканцэнтроўваць у шматмільённых сумах у адзінай дзяржаўнай скарбонцы і накіроўваць гэтыя сродкі на сацыялістычнае будаўніцтва.

Лічачы абавязковым для членаў партыі дапамогу рабоча-сялянскай дзяржаве непасрэдным удзелам і асабістым прыкладам у гэтых мерапрыемствах, ЦКК УсеКП(б) прызнае, што камуністыя, на долю якіх прыпадаюць выйгрышы па аблігацыях дзяржаўных пазык, атрымліваць іх могуць, прычым з выйгрышаў да 1.000 руб. ніякіх партыйных адлічэньняў быць не павінна. Пры выйгрышах-жа звыш 1.000 руб. разьмер адлічэньня ў фонд партыйнай узаемадапамогі павінны ўстанаўляць у кожным асобным выпадку месцовыя КК.

КК у гэтых выпадках павінны грунтавацца на матар'яльнай забясьпечанасьці члена партыі і яго сям'і, або яго гаспадарчых патрэбах, асабліва гаспадарчых патрэбах камуністага-селяніна. У той-жа час КК павінны ўлічваць, каб выйгрыш не садзейнічаў зьлішествам і адрыву камуністага ад працоўных умоў жыцьця.

Сакратар ЦКК УсеКП(б)
Е. ЯРАСЛАЎСКІ.

II-ая СЭСІЯ ЦВК БССР.

Рацыяналізацыя савецкага апарату ў БССР

ДАКЛАД НАРОДНАГА КАМІСАРА РСІ-ЦКК ТАВ. КАЛНІНА.

Перш усяго трэба сказаць, што наш дзяржаўны апарат ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту і будаваньня сацыялізму натуральна павінен быць прыстасован да правядзеньня тых асноўных задач, якія стаяць перад пралетарскай дзяржавай і рабочай клясай. Ня гледзячы на цэлы рад недахопаў у нашым дзяржаўным апараце ён прыстасован значна бліжэй да рабочых і сялянскіх мас чым які-небудзь іншы дзяржаўны апарат у сьвеце. І гэта зусім зразумела, бо наш дзяржаўны апарат прызваны ажыцьцяўляць дыктатуру пралетарыяту і будаваць сацыялістычную гаспадарку.

Тая бюракратычная справаздачнасьць, якая мела месца ў нашым дзяржаўным апараце выяўлала з сябе такую грозную вялічыню, над якой трэба было задумацца. Райфінчастка РВК павінна была ў год запоўніць каля 1.300.000 клетачак. Раённы культурна-асьветны працаўнік павінен быў запоўніць ў год каля 96.000 клетачак. Гэтае мноства лічбаў гаворыць аб тэй нікчэмнай статыстыцы, аб тых нікчэмных справаздачах, якія ў нас праводзіліся. Гэта не давала магчымасьці нізавым органам займацца прадукцыйна сваёй працай. Адсюль узьнікалі пагрэшнасьці, якія ствараллі вялікія цяжкасьці ў агульным пляне работы. Бюракратызму ў нашым апараце было шмат

Каб памянёныя недахопы зьнішчыць, мы павінны былі пераглядзець зьверху да нізу ўсю структуру нашага дзяржаўнага апарату. За тым трэба было ліквідаваць усе роўнаналежныя функцыі, якія іспавалі ўнутры саміх апаратаў, а так сама паміж асобнымі наркаматамі. Адначасова трэба было ўстанавіць тое, каб цэнтральныя наркаматы зьяўляліся плянуючымі органамі, даючы агульныя ўказаньні і інструкцыі нізавому дзяржаўнаму апарату. Уся цяжкасьць работы такім чынам была перанесена на ніжэй стаячыя дзяржаўныя органы. Гэта мерапрыемства, якое робіць наш апарат больш тапным адначасова прыбліжае яго да рабочых і сялян. Мы прадаставілі акрвыканкомам, райвыканкомам, гарсаветам і сельсаветам цэлы шэраг праў, якіх яны раней ня мелы.

Адначасова намі была праробленa вялізарная работа ў сэнсе рацыяналізацыі і ўпрашчэньня справаздачнасьці і статыстыкі.

Калі гаварыць аб тэй эканоміі, якую дало скарачэньне дзяржаўнага апарату, то я магу прывесьці некалькі лічбаў. З 6.227 штатных адзінак, якія знаходзіліся па дзяржаўным і мясцовым бюджэце мы скарацілі 2.034 чал., што дае ў год эканоміі 2.240.000 руб. Гэта лічба праверана, яна рэальная.

Акрамя гэтага намі была праведзена работа па рацыяналізацыі і скарачэньні гаспадарчага апарату. Але гэта работа намі яшчэ не скончана. У гаспадарчым апараце мы таксама знайшлі бюракратызм, тую-ж цэнтралізацыю. У нас у гаспадарчым апараце цэнтральных установаў мелася 4.193 служачых, мы скарацілі 1.502 чалавекі, што дало эканоміі 3.115.000 руб. Тут вялікае месца займаюць розныя прадстаўніцтвы маскоўскіх цэнтральных установаў.

Агулам уся эканомія па рацыяналізацыі дзяржаўнага і гаспадарчага апарату складае 5.395.000 рублёў.

Мы павінны адзначыць, што нягледзячы на такое значнае скарачэньне, апарат пачаў лепш працаваць, і гэта ўжо шмат якія працаўнікі пачалі прызнаваць.

Трэба адзначыць, што з боку нізавых прафэсыянальных і партыйных арганізацый РСІ ў сваёй рабоце атрымала вялікую дапамогу. У тыя-ж часы РСІ ўсямерна старалася ўцягнуць у гэту працу як можна больш шырокія рабочыя масы, а таксама тых працаўнікоў, якія працуюць ў даным апараце.

Я павінен указаць, што з боку друку ў гэтым напрамку таксама была праяўлена максымальная ўвага да гэтага пытаньня. Мы атрымалі вялікую падтрымку з боку друку, які стварыў неабходную грамадзкую думку вакол гэтага пытаньня.

Пасьля спрэчак сэсія абрала камісію для распрацоўкі пастаноў па дакладу т. Калніна аб рацыяналізацыі савецкага апарату.

Перавыбары ў каапэрацыі.

Павялічым паявы капітам.

ОРША. (Уласн. кар.). Справаздачна-перавыбарчая кампанія Аршанскага ЦРК хутка закончыцца. Ужо адбылося 17 сходаў. Сходы шырока абгаворвалі працу праўленьня і паасобных крам.

Галоўная ўвага была зьвернута на пытаньні разьмеркаваньня дэфіцытных тавараў, неабходнасьць паляпшэньня грамадзкага харчаваньня і хлебапячэньня. Адзначана таксама неабходнасьць павялічэньня паявога капіталу і далейшага зьніжэньня цэн. Па 17 сходах падана 400 запытаньняў дакладчыкам.

Новае пазыкова-ашчаднае таварыства.

ЗЕМБІНА. Усяго па мястэчку ёсьць пайшчыкаў у сельска-гаспадарчай каапэрацыі 130 чалавек і ў спажывецкай—280. Местачковым саветам ужываліся захады да ўцягненьня пайшчыкаў праз камітэты ўзаемадапамогі і праз пастаноўку дакладаў на агульных сходах. Праведзен вучот усіх пайшчыкаў і вучот некаапэраванай беднаты.

Старшыня каапэрацыйнай камісіі вядзе нагляд за зьнішэньнем цакладных выдаткаў і розьнічных цэн. Таксама каапэрацыйная камісія местачковага савету глядзіць за правільным скарыстаньнем і разьмеркаваньнем крэдытаў с.-г. каапэрацыі. За апошні час ёсьць рост пайшчыкаў; у с.-г. каапэрацыі лік пайшчыкаў павялічыўся на 25, а ў спажывецкай—на 18.

Яўрэйскае працоўнае насельніцтва арганізавала пазыкова-ашчаднае таварыства саматужнікаў, у якое ўваходзіць 65 чал.

Сувязь з каапэрацыйнымі арганізацыямі падтрымліваецца праз каапэрацыйныя сэкцыі і праз заслуханьне справаздач праўленьняў на пасяджэньнях прэзыдыуму і на пленумах местачковага савету.

С. Г.

Пытаньні замежнага гандлю.

(Савецкі экспарт).

Становішча нашага замежнага гандлю зьяўляецца адным з найбольш слабых вучасткаў гаспадарчага фронту. У той час, як у галіне аднаўленьня народнай гаспадаркі мы ўжо ў мінулым годзе перайшлі за даваенную рысу, а ў гэтым годзе перавысім яе на 15—16 проц.—у галіне замежнага таваразвароту мы ледзь дасягаем 50—60 проц. даваеннага.

Між тым, значэньне нармальна наладжанага абмену з разьвітымі краінамі капіталізму для нас надзвычайна важна. Паставіўшы сваёй мэтаю ажыцьцяўленьне індустрыялізацыі краіны і вызваленьне яе ад капіталістычнай залежнасьці, мы зусім не зьбіраемся адмаўляцца ад ўжыцьця ў нашай сацыялістычнай прамысловасьці ўсіх навейшых дасягненьняў разьвітай тэхнікі. Усім папярэднім ходам разьвіцьця нашай эканомікі мы пастаўлены ва ўмовы неабходнасьці звароту да заграніччных рынкаў у галіне сырцу і матар'ялаў, у галіне набыцьця машын і варштатаў у першую чаргу для тых галін прамысловасьці, якія самі маюць вы пачэньне вытвараць сродкі вытворчасьці.

На працягу раду год аднаўленчага пэрыяду народнае гаспадаркі мы мелі павялічваючуюся крывую прывозу ў нашу краіну сырцу і паўфабрыкатаў (бавоўна, шэрсьць, кажаровыя і чорныя мэталы, каучук, фарбы і г. д.) і прывозу заграніччнага абсталяваньня як для лёгкай, так і, галоўным чынам, для цяжкай індустрыі. Разьмеры нашага імпарту акрэсьліваліся і залежалі амаль цалком ад таго, колькі мы замест гэтага магчы былі вывозіць сваіх зьлішкаў. Нашы вялізарныя патрэбы ў імпарце мы павінны падганяць да рэальных магчымасьцяй нашага экспарту, таму што таваразварот з заграніцаю да гэтага часу базіруецца пераважна на налічным разьліку, ці на вельмі каротка-тэрміновым крэдыце, адгэтуль вынікае, што ўсякае фарсаваньне імпарту простым чынам упіраецца ў абём нашага экспарту і што без разгортваньня і ўзьняцьця вывазу—мы не атрымаем у патрэбнай колькасьці і ўсяго неабходнага да ўвозу. Між тым, іменна ў экспарце больш за ўсё парушаны суадносіны з даваенным.

Значнае зьніжэньне разьмераў экспарту тлумачыцца цэлаю групаю эканамічных і палітычных фактараў. Асабліва рэзкае выяўленьне яны атрымалі ў галіне сельска-гаспадарчага экспарту. У выніку рэвалюцыі сялянства вызвалілася ад значнай часткі цяжараў і падаткаў, якія забіралі ад яго па заграніччным рынкі прадукты сельскай гаспадаркі ў абставінах самай жорсткай беднаты недаяданьня мільёнаў. «Недаямо, а вывязем»—такім быў лёзунг паліцэйска-памешчыцкай эканомікі. Бясспрэчным зьяўляецца цяпер факт унутранога спажываньня вёскі, значны рост попыту і гораду, і вёскі на глебе агульнага росту добрабыту мас. Іншымі прычынамі скарачэньня сельска-гаспадарчага экспарту зьяўляецца досыць значнае павялічэньне насельніцтва Саюзу (на 10 мільён. чалавек звыш даваеннага ў межах сучаснай тэрыторыі).

Агульны экспарт з СССР па эўрапейскай і азіяцкай граніцах за апошнія тры гады характарызуецца наступнымі данымі (у мільёнах чырвоных рублёў).

	1924-25 г.	1925-26 г.	1926-27 г.
С.-г. экспарт	310,6	403,7	439,5
Проц. росту	100	130	141
Прам. экспарт	264,6	272,9	331
Проц. росту	100	103	125
Агульн. экспарт	575,2	676,6	770,5
Проц. росту.	100	117,6	133,9

З табліцы перш за ўсё відаць, што сельска-гаспадарчы экспарт па сваіх разьмерах значна перавышае прамысловы, складаючы ў 1924-25 годзе—54 проц., а ў 1926-27 г.—57,1 проц. усяго экспарту. Асноўнымі таварамі нашага сельска-гаспадарчага экспарту зьяўляюцца хлебапрадукты, лён, пушніна, масла, яйкі, рыбапрадукты.

Зусім відавочна, што наша сельская гаспадарка яшчэ на доўгі пэрыяд будзе займаць галоўную ролю ў нашым вывазе. Таму, ставячы задач ўсямернага разгортваньня экспарту, мы павінны вырашыць яе ў першую голаву па лініі тых мерапрыемстваў, якія здольны стымуляваць прапанову сялянствам сваіх зьлішкаў.

У гэтым годзе сельска-гаспадарчая прадукцыя ўжо значна перавальвае за даваенную, мы маем у краіне трэці паўторны ўраджай, мы маем, значыць, узмацненьне таварных рэсурсаў вёскі. Правільнай эканамічнай палітыкай у адносінах да сялянства мы павінны змагчы зьбіраць яго таварныя зьлішкі для мэтаў экспарту. Першачарговай задачай бягучага моманту ў галіне сельска-гаспадарчага экспарту зьяўляецца ўзьняцьце хлебазагатовак, якія далі значнае недавыкананьне плану за першыя месяцы кампаніі. Вельмі значную ролю ў справе разьвіцьця сельска-гаспадарчага экспарту іграе задача ўзмацненьня другарадных прадметаў вывазу. Мы павінны аднавіць і наладзіць экспарт цэлага раду прадуктаў земляробства, жывёлагадоўлі і птушніцтва, якія ў старыя часы давалі значную валютную выручку і якія ў нас да гэтай пары яшчэ знаходзяцца або ў неразьвітым стане, або зусім не экспартуюцца (насеньне, фрукты, гародніна, грыбы, ягады, мёд, рогі, косьці, альбумін і інш., і ін.).

Наступнаю складанаю часткаю нашага вывазу зьяўляецца прамысловы экспарт. Як відаць з табліцы, доля яго ва ўсім экспарце складала ў 1926-27 годзе—42,9 проц. У параўнаньні з даваенным мы маем значнае павялічэньне часткі прамысловага экспарту, які складаў раней, прыкладна, адну трэцюю частку ад агульнага вывазу. Асноўнымі прадметамі прамысловага экспарту зьяўляюцца: нафтапрад. лесаматар'ялы, руда марганцавая, цукар, жмыхі, тканіны. У галіне разьвіцьця прамысловага экспарту мы маем ужо вялізарныя посьпехі. Савецкі нафтавы экспарт з 140.000 тон у 1921-22 г. узьняўся да 2.086.000 тон у 1926-27 г., даўшы павялічэньне ў 14 раз і перавысіўшы на 250.000 тон самы высокі вываз старога часу (1904 г.). Нашы нафтапрадукты пакрываюць звыш 10 проц. усяе патрэбнасьці Заходняй Эўропы. Тэмп разьвіцьця нашага лесаэкспарту хоць і адбываецца марудным крокам, але ўсё-ж за 6 год (1921-22—26-27) ён узьнімаецца ад нуля да 79 мільёнаў рублёў, складаючы ў агульным экспарце Саюзу 10,3 проц. пры частцы яго ў даваенным экспарце ў 9,8 проц. (1913 г.). Значныя дасягненьні мы маем і ў галіне адпраўкі нашага экспарту на Ўсход, гандаль з якім у нас адбываецца на пачатках пэтта-балянсу, гэта значыць вывазу ва ўсходнія краіны нашай прадукцыі на такую-ж суму, на якую мы прывозім іх тавараў (бавоўна, шэрсьць, рыж, сушаныя фрукты, цытрыны і інш.).

Ня гледзячы на маючыяся посьпехі, мы павінны прызнаць, што разьвіцьцё нашага прамысловага экспарту ўсё яшчэ невыстарчальнае, што ў нас застаецца не разьвітым цэлы рад артыкулаў, якія могуць даць валюту, што абём экспарту асноўных прадметаў—лесу і нафты—можа і павінен быць намі павялічаны. Галоўнейшымі перашкодамі разгортваньня прамысловага экспарту зьяўлялася невыстарчальнасьць укладаў у асноўны капітал экспартных галін прамысловасьці. Нашы экспартныя арганізацыі працуюць на тэхнічна адсталым паношаным абсталяваньні. Рубка лесу адбываецца ў нас па мэтадах 18-га веку. Пры нашых вялізарных рыбных багацьцях мы эксплёатуем іх спосабамі, якія нічым не адрозьніваюцца ад прыёмаў старажытных вякоў. Галіны прамысловасьці, якія працуюць на экспарт, патрабуюць рашучага пераабсталяваньня сваёй вытворчатэхнічнай базы, што зьвязана з неабходнасьцю ўлажэньня сродкаў у асноўны капітал гэтых галін. Павышэньне тэхнічнай базы прадпрыемстваў палягчае канкурэнцыйную здольнасьць нашых прадуктаў на замежным рынку ў адносінах да якасьці і сабекошту. Тая страта, якую прыносіць нам рад нашых экспартных вырабаў, у значнай меры абумоўліваецца слабасьцю, адсталасьцю нашых прадпрыемстваў, хоць немалую ролю ў страце іграе як розьніца паміж валютамі, так і вялічыня накладных гандлёвых выдаткаў. Задачы ўзмацненьня прамысловага экспарту патрабуюць нашых максымальных намаганьняў у справе ўдыму экспартных галін. Бліжэйшай задачаю ў гэтым сэнсе зьяўляецца ўважлівы аналіз і правядзеньне ўсіх тых мер, якія могуць забясьпечыць ня толькі выкананьне экспартнага пляну бягучага году, але і даць дадатковы экспарт пры ўмове дадатковых укладаў сродкаў у экспартныя артыкулы. Таксама, як у сельска-гаспадарчым экспарце, мы павінны ўсямерна пашырыць намэнклятуру артыкулаў прамысловага экспарту, узьнімаючы да вывазу ўсе тыя дробныя артыкулы, якія ў мінулы час давалі дзесяткі мільёнаў рублёў.

Сапраўднае вырашэньне пастаўленае перад намі самае складанае задачы—ўдыму і разгортваньня экспарту—можа быць выканана толькі шляхам ўцягненьня ў гэту тадачу ўсяго нашага гаспадарчага актыву, шляхам бязупыннага ўдзейнічаньня і нагляданьня за ходам экспарту з боку партыйных і прафэсыянальных арганізацый, шляхам усямернага разгортваньня ініцыятывы мясцовых органаў.

Пяцігадовы плян разьвіцьця народнае гаспадаркі прадугледжвае павялічэньне экспарту к 1931-32 году амаль удвое супроць існуючага. Гэта выключная па важнасьці праблема, якая стварае прадпасылкі для самага шпаркага прасоўваньня на шляху індустрыялізацыі можа і будзе ажыцьцёўлена ўпартаю воляю і энэргіяй усіх арганізацый рабочае д

Новая сялянская пазыка

—ШЛЯХ ДА ЎТВАРЭНЬНЯ НОВАЙ ВЁСКІ.

Агітацыйная работа—на першым пляне.

Новая сялянская пазыка зьявіцца мацнейшым падважнікам у справе ўздыму нашай сельскай гаспадаркі. Таму задача рэалізацыі новай пазыкі павінна стаць ударнай задачай.

На нашы грамадзкія арганізацыі ў вёсцы—партыйныя і камсамольскія ячэйкі, сельсаветы, райвыканкомы, каапэрацыю, школы ўскладаецца вялікая адказная праца. Гэтыя арганізацыі павінны разгарнуць ваўсю агітацыйную работу—усюды растлумачыць сялянам, што пазыка прынясе рэальную карысьць ня толькі дзяржаве, але ў лічэ большай ступені самому сялянству.

Апрача таго, што пазыка дае пэўны прыбытак (6 проц. гадавых) і вялікія шансы на выйгрыш (ад 50 да 1000 руб.)—дзесятая частка сабраных па пазыцы сродкаў перадаецца ў мясцовыя-раённыя бюджэты.

Што гэта значыць? Гэта значыць, што ад кожнай сотні рублёў, якая затрачана сялянствам данага раёну на набыцьцё аблігацый, 10 р. ідзе ў бюджэт раёну.

Гэта значыць, што тыя раёны, якія актыўна возьмуцца за рэалізацыю, атрымаюць у свае бюджэты значную суму грошай. Гэта значыць, што атрыманыя сумы пойдуць на здавальненьне мясцовых гаспадарчых і культурных запатрабаваньняў: на арганізацыю грамадзкіх млыноў, на земляўпарадкаваньне, на рамонт дарог, на набыцьцё пажарнага інвэнтару, на школьнае будаўніцтва.

Трэба адначасова растлумачыць сялянам, што грошы, сабраныя па пазыцы, складаюць толькі нязначную частку таго, што выдае дзяржава на здавальненьне запатрабаваньняў сельскай гаспадаркі. Трэба, каб сялянства ведала аб тым, што ў 27-28 г. савецкая дзяржава ўкладвае ў сельскую гаспадарку 700 мільёнаў рублёў. Я. С.

Пазыка вельмі карысна для сялян.

(Гутарка з старшынёю праўленьня Белсельбанку тав. Дубінай).

Выпускаемая 4-я сялянская пазыка мае асноўнай мэтай узмацненьне і далейшае разьвіцьцё сялянскай гаспадаркі. Пазыка набывае ў сучасны момант вялізнае палітычнае значэньне. Актыўная самадзейнасьць сялянства і ўлажэньне насельніцтвам свабодных сродкаў у пазыку дасьць магчымасьць правесьці рад мерапрыемстваў, для хутчэйшага разьвіцьця нашай краіны. Таму сялянства павінна прыняць рашучы ўдзел у рэалізацыі гэтай пазыкі шляхам куплі аблігацый.

Гэтая пазыка вельмі карысна для сялянства ня толькі тым, што яна ідзе на ўзьнятьцё гаспадаркі і земляўпарадкаваньне, але і тым, што 10 проц. яе пойдзе на палепшэньне добрабыту вёскі.

Мінулая трэцяя сялянская пазыка ў суме 500.000 руб. была насьпяхова рэалізавана, а сыстэмай Белсельбанку наша рэспубліка аказалася на першым месцы ў СССР, рэалізаваўшы 86 проц. пазыкі.

Я лічу, што распаўсюджваньне новай пазыкі было-б мэтазгодна не распыляць, а сканцэнтраваць вакол аднаго апарату, які блізка стаіць да сялянства і мае ў гэтых адносінах практычны вопыт. Такім апаратам у нас можа быць Белсельбанк.

НАША АНКЕТА.

Сяляне аб новай пазыцы.

Неабходна правесьці шырокую агітацыю сярод сялянства аб такім неабходным мерапрыемстве, як пазыка ўзмацненьня сельскай гаспадаркі. Я лічу, што сялянства на сваіх агульных сходах павінна азнаёміцца з важнасьцю гэтае пазыкі, і я ўпэўнен, што падпіска на пазыку будзе праведзена ўсёй вёскай. Купляючы аблігацыі новай пазыкі, селянін палепшае гэтым самым сваю гаспадарку і ўзмацніце краіну.

ПАЎЛАЎ—*член ЦВК БССР, Селянін вёскі Дэршына, Горанскага раёну.*

* * *

Дзяржава сваімі сродкамі ў сучасны момант ня можа значна дапамагчы нашай сельскай гаспадарцы. Патрэбна дапамога дзяржаве з боку ўсяго сялянства. Сялянская пазыка—гэта будзе неабходная дапамога дзяржаве ў справе ўзьнятьця нашае сельскае гаспадаркі. Набываючы аблігацыі новай пазыкі, мы гэтым самым узмацняем нашу гаспадарку і дапамагаем сацыялістычнаму будаўніцтву нашай краіны. Я ўпэўнены, што сялянства зразумее неабходнасьць і важнасьць пазыкі і два мільёны рублёў, адпучаныя для рэалізацыі ў БССР, будуць рэалізаваны поўнасьцю.

Глушонак, *селянін Чэрвенскага раёну.*

* * *

Дзяржава сама ня можа ўкладсьці выстарчальных сродкаў на разьвіцьцё сельскае гаспадаркі, а дзеля гэтага неабходна актыўнасьць саміх сялян у справе ўзьняцьця сельскае гаспадаркі. Мы гэта можам зрабіць пры дапамозе выпушчаемай новай сялянскай пазыкі.

Неабходна, каб усе газэты, усе грамадзкія і партыйныя арганізацыі азнаёмілі сялянства са ўсімі выгадамі гэтае пазыкі і я ўпэўнены, што пазыка будзе поўнасьцю рэалізавана ў вёсцы.

СТРАЛКОВІЧ.—Селянін вёскі Ўзьбішча, Плешчаніцкага раёну.

Ніводнага селяніна без аблігацыі!

(На сходзе сялян—членаў ЦВК).

12-га студзеня адбыўся сход рабочых і сялян—членаў ЦВК БССР, на якім быў заслуханы даклад аб задачах пазыкі ўзмацненьня сельскае гаспадаркі.

Сходам вынесена рэзалюцыя, у якой гаворыцца:

Мы заклікаем усё працоўнае сялянства Беларусі прымаць актыўны ўдзел ў рэалізацыі пазыкі, якая павінна праходзіць пад лёзунгам—«ніводнага сялянскага двара без аблігацыі».

Аблігацыя ў руках селяніна—пасьведчаньне яго актыўнага ўдзелу ў будаўніцтве сацыялізму ў нашай краіне.

Хроніка кампаніі.

— **Саюзны Наркамфін разаслаў усім Акрфа апэрацыйна-агітацыйны матар'ял па «пазыцы ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі".**

— **Наркамфін БССР мяркуе выдаць спэцыяльны нумар газэты ў межах БССР, прысьвечаны пазыцы, які будзе разасланы ўсім падпісчыкам газэт.**

— **У бліжэйшы час Наркамфінам будзе выпушчана спэцыяльная насьценная газэта па ўсіх сельсаветах, хатахчытальнях і дамох селяніна.**

— **Кампанія па рэалізацыі пазык пачнецца ад 1-га лютага і працягнецца 2 месяцы.**

ЯК ІДЗЕ ЗАГАТОЎКА ХЛЕБА І СЫРЦУ ПА БССР.

Ненармальнасьці з загатоўкай ільну-валакна.—На Віцебшчыне маюцца запасы валакна, а прамысловасьць адчувае ў ім недахват.—Нізавая сетка ня мае інструкцый. Безадказнасьць праўленцаў--спэцыялістых. Канкурэнцыя з боку прыватніка.

Сырэц і хлеб.

(Да пастаноў 15-га партзьезду).

Шмат намаганьняў робіць савецкая ўлада, каб зьнішчыць у нас таварны голад і забясьпечыць сялянства і рабочых усімі неабходнымі таварамі.

Павялічэньне вырабу тавараў залежыць у вельмі моцнай ступені ад павялічэньня пасеваў тэхнічных культур, як бавоўны, ільну, пяньки, сланэчніка, цукровых буракоў і інш., а таксама павялічэньня жывёлагадоўлі.

Выступіўшы на 15-м партыйным зьезьдзе тав. Рыкаў зазначыў, што савецкая ўлада правяла цэлы рад мерапрыемстваў для павялічэньня пасеваў тэхнічных культур і павялічэньня іх ураджайнасьці. Так, устаноўлены выгадныя сялянству загатовачныя цэны на сырэц, уведзена кантрактацыя пасеваў, якая павялічваецца з кожным годам, устаноўлены ільготы па сельгаспадатку для пасеўшчыкаў тэхнічных культур; уводзіцца ўсё больш і больш розных тавараў у вёску і арганізован завоз таннага хлеба ў дастатковай колькасьці ў раёны апрацоўкі ільну і бавоўны. Усе гэтыя мерапрыемствы ўжо ў 1926-27 гаспадарчым годзе прывялі да павялічэньня пасеўных плошчаў тэхнічных культур і да падняцьця іх ураджайнасьці. Гэта дае магчымасьць у бягучым годзе значна павялічыць выраб тавараў.

Асобнае значэньне для далейшага павялічэньня пасеўных плошчаў бавоўны і ільну мае забясьпячэньне ў дастатковай колькасьці раёнаў бавоўнаводзтва і ільнаводзтва танным хлебам. Калі танны хлеб ня будзе завозіцца туды ў дастатковай колькасьці, дык сялянства гэтых раёнаў будзе само павялічваць пасевы жыта і пшаніцы, памяншаючы пасевы ільну і бавоўны. Такое становішча ў нас наглядалася ў 1926 г., калі цэны на жыта ў ільнаводных губэрніях, увесь час павышаліся. Гэта выклікала скарачэньне пасеўных плошчаў ільну ў асноўных ільнаводчых раёнах і валавы збор зьнізіўся.

Таксама было ўвясну 1926 г. у Сярэдняй Азіі, калі сяляне з-за недастатку прывознай пшаніцы, павялічылі пасевы яе і спынілі рост пасеваў бавоўны. А ўзмоцненае забясьпячэньне танным хлебам ільнаводаў і бавоўнаробаў у канцы 1926 і 1927 г. выклікала павялічэньне пасеўных плошчаў ільну і бавоўны, што дае магчымасьць павялічыць вытворчасьць ільняных і бавоўняных тканін.

У сваім заключным слове на зьезьдзе тав. Рыкаў гаворыць: «Калі мы ня зможам хоць бы на працягу аднаго з падыходзячых 5-ці год даць хлеб у раёны бавоўнаводзтва, ільнаводзтва, у раёны лесазагатовак, то гэтым самым будуць падарваны і такія гаспадарчыя элементы, ад якіх залежыць становішча ўсёй гаспадаркі ў цэлым».

Нам трэба яшчэ шырэй разгарнуць нашу прамысловасьць, каб зьнішчыць таварны голад. А для гэтага трэба больш с.-г. сырцу. Як сказаў тав. Рыкаў, «імянна ў недахопе сырцу заключаўся галоўны тормаз для больш узмоцненага разгортваньня лёгкай прамысловасьці» (г. зн. прамысловасьці, якая вырабляе прадметы шырокага ўжытку). Але вытворчасьць сырцу ў сваю чаргу залежыць ад таго, ці будзе ў руках дзяржавы досыць хлеба для забясьпячэньня сырцовых раёнаў.

Ланцужок—хлеб—сырэц—прамысловы тавар неразрыўна зьвязаны. Хлебазагатоўкі—важнейшае зьвяно ў гэтым ланцужку. Прадаць больш хлеба дзяржаве **гэта значыць забясьпечыць больш сырцу для прамысловасьці дапамагчы ў разгортваньні прамысловасьці.** Гэта павінен памятаць кожны селянін.

Зьезд зазначыў па неабходнасьць узмацненьня хлебазагатовак і цьвёрдага няўхільнага выкананьня пляну завозу хлеба ў ільнаводныя губэрні і раёны па разьвядзеньні бавоўны ў Сярэдняй Азіі. Гэта дырэктыва зьезду павінна быць і будзе выканана.

Чаму ня выканаў плян Хлебапрадукт на Беларусі.

(Гутарка з упоўнаважаным Хлебапрадукту тав. Макальскім).

Гадавы плян хлебазагатовак для Хмебапрадукту выкапан толькі на 10 проц.

Перашкодаю ў загатоўцы ў асноўным зьяўляецца тое, што апарат Хлебапрадукту ў асноўным вядзе апэрацыі рэалізацыйнага характару і згуртаваў, галоўным чынам сваю ўвагу ў гарадох, якія зьяўляюцца спажываючымі цэнтрамі.

Зразумела, што ў гэтых мясцох весьці загатоўку тэхнічна немагчыма, бо найбольш багатымі раёнамі хлебам зьяўляюцца Слуцкі і Клімавіцкі, а не гарады. Пабудова-ж спэцыяльнай загатоўчай сеткі ва ўмовах Беларусі не апраўдвае сябе, таму магчымасьць і ў далейшым весьці загатоўкі па мясцовым рынку вельмі абмежевана.

Тым ня менш, паколькі наша каапэрацыя не скарыстала ўсе магчымасьці загатаўляць праз свае разгалінаваньня сеткі, мы прымушаны будзем кінуць частку налічнага складу нашага апарату ў глыбіню пунктаў і весьці перагаворы з Дзяржгандлем аб выкарыстаньні яго пунктаў. Там, дзе тэхнічна будзе магчыма, мы ня спынімся нават перад адчыненьнем часовых загатоўчых пунктаў.

Аднэй з прычын зрыву загатоўчага пляну зьяўляецца вялікая канкурэнцыя з боку прыватніка, які выкарыстоўвае пашы млыны для пераапрацоўкі гэтае прадукцыі ў высокасортную прадукцыю. Вялікую ролю ў невыстарчальнай загатоўцы іграе фактар пашырэньня сялянскімі гаспадаркамі жывёлагадоўлі, з прычыны чаго паменшыўся завоз кармавых траў. Пры нізкіх цэнах на жытнюю муку, значная частка яе скарыстоўваецца для кармавых мэтаў. Мерапрыемствы, якія ўхвалены рэгулючымі органамі, а таксама і хлебазагатоўкамі з свайго боку, думаем палепшаць загатоўку.

Па абсьледваньні мною некаторых округ, такі пералом у настроях хлебазагатоўчых органаў, а таксама і на самым рынку, ужо ёсьць.

На гэтых днёх для ўзмацненьня загатовак і прысьпяшэньня арганізацыйных перагруповак апарату ў округі выяжджаюць упоўнаважаныя Хлебапрадукту.

Каапэрацыя і прыватнік.

(Ад нашага бабруйскага карэспандэнта).

За другі квартал плян хлебазагатовак выкапан на 28 проц.

У пляне было намечана загатовіць 4.057 тон збожжа, а загатоўлена толькі 1.145 тон.

За апошні час наглядаецца значнае паслабленьне паступленьня збожжа на хлебазагатоўчыя пункты. Гэта ня зьвязана з адсутнічаньнем збожжа ў сялян, а з тым, што сялянства пайшло на заработкі ў сувязі з шырокімі лесараспрацоўкамі па ўсёй акрузе, адкуль атрымала значныя грашовыя прыбыткі ў гаспадарцы.

У сучасны момант ужыты належныя меры па ўзмацненьні здавальненьня вёскі належнымі прамтаварамі. У бліжэйшыя дні вясковым каапэратывам адпускаецца іх па 300.000 руб.

Разам з гэтым трэба адзначыць некаторае блязьдзейнічаньне нашых каапэрацыйных арганізацый. Так, акрсельсаюз заданьне выканаў на 6 проц.. Дзяржгандаль па ільняным семі —на 16 проц., між тым, акрсаюз спажывецкай каапэрацыі сваё заданьне выканаў на 39 проц., а хлебапрадукт—на 36 проц., у той час, як такая вялікая арганізацыя, як акрсельсаюз павінна была стаяць на першым месцы.

Значную ролю іграе прыватны гандляр, асабліва ў загатоўцы ільнянога семя. Напрыклад, гандляр Фрыд,у сувязі з вялікімі посьпехамі на рынку абсталяваў сваю маслабойку без адпаведнага на гэта дазволу.

Свачасова камунгандлем былі ўжыты належныя меры і прадпрыемства Фрыда зачынена з налажэньнем на яго штрафу ў 300 р.

Апрача гэтага, закрыта 7 прыватных маслабоек з прычыны антысанітарнага іх становішча.

Камунгандаль распрацаваў рад мерапрыемстваў па ажыўленьні хлебазагатоўчай кампаніі. Спажывецкія таварыствы будуць прэм'іраваны за лепшую працу па хлебазагатоўках. Для гэтай мэты складаецца рэзэрвны фонд у 350.000 руб. Але гэтага мала. Нам зараз неабходна ўсім выступіць арганізавана на хлебазагатоўчым фронце, прыцягваючы да гэтай справы ўсе савецкія і грамадзкія арганізацыі.

Ч.

Загатоўкі хлеба і сырцу на мясцох.

(Па тэлефону ад нашых акруговых карэспандэнтаў).

На Случчыне хлебазагатоўкі ўзмацняюцца.

СЛУЦАК. Хлебныя загатоўкі з кожным днём узмацняюцца і за апошнія дні складалі 800 пуд. хлеба ў дзень. Сёньня загатоўка хлеба ўжо складае 1.000 пуд. Мясцовыя працаўнікі раскачаліся, але ня ўсюды. Каапэрацыйныя органы сталі праяўляць выстарчальную ініцыятыву.

Ненармальнасьці з загатоўкай ільну-валакна.

ВІЦЕБСК. У раёнах Ліозна і Калышка ў невялікіх нізавых загатоўчых пунктах Белдзяржгандлю і с.-г. каапэрацыі знаходзяцца вялікія запасы ільну-валакна, больш 12 вагонаў. Гэтыя запасы хаваюцца ў драўляных хлявох, у якіх няма інструмантаў па пажарнай аховс. У тыя-ж часы прамысловасьць мае невялікія запасы ільнавалакна (на тыдні два), а склады загружаны вялікай колькасьцю валакна.

Спрыяючыя ўмовы работы.

БАБРУЙСК. Умовы працы большмення спрыяючыя. Мясцовыя прадстаўнікі ня толькі на словах, але і па справе адмовіліся ад ведамственых інтарэсаў і праводзяць агульную лінію па ўзмацненьні загатоўкі хлеба і экспартнага сырцу.

Нізавая сетка ня мае інструкцый.

ВІЦЕБСК. Нізавая каапэрацыйная сетка, маючы запасы ільнасемя не атрымлівае парадаў і ня ведае, куды іх накіроўваць. Адсутнічаюць прыёмшчыкі для прасоўкі ільняного семя і разьмеркаваньня па сартох. Нізавая сетка таксама ня мае ніякіх інструкцый у адносінах загатоўкі скуранога сырцу. Апошні звальваецца ў кучу ў парным відзе. Падмосткаў для кансэрваваньня скурсырцу ня маецца.

Спэцыялістыя па сырцу часта кіруюць праўленьнямі каапэратываў, а не наадварот. Адсутнічае кіраўніцтва звыш, няма інструктаваньня. Нізоўка праяўляе тэндэнцыю да выжываньня дзяржаўных загатоўцаў, каб ніхто іх не кантраляваў, ім не перашкаджаў. Адчуваецца безадказнасьць праўленцаў — спэцыялістых. Каапэрацыя амаль што нічога не зрабіла па разьвіцьці другарадных відаў экспарту. Загатоўкі экспартнага сырцу павялічваюцца.

Становішча ў Аршаншчыне і Магілеўшчыне.

ВОРША. У Клімавіцкім раёне значна павялічваюцца загатоўкі ў прыватнасьці экспартнага сырцу. Каапэрацыя лічыць мажлівым загатовіць сырцу звыш намечанага пляну.

У першым квартале па Аршанскай акрузе загатоўлена 35.000 ільну-валакна. Плян выканан поўнасьцю.

У Магілеўскай акрузе плян па загатоўцы ільну ў першым квартале выканан на 65 проц. Але ў студзені прыкмячаецца некаторае ажыўленьне.

У Магілеўскай і Аршанскай акругах загатоўлена 200.000 пуд. ільну-валакна.

Загатоўчыя арганізацыі тармазяць працу шчацінных фабрык.

ГОМЕЛЬ. У сувязі з ростам заграніцай попыту на нашу шчаціну, Віцебская і Гомельская шчацінныя фабрыкі пераходзяць на апрацоўку шчаціны па новым спосабе, які робіць выпрацоўку больш таннай.

Праца шчацінных фабрык тармазіцца загатоўчымі арганізацыямі, у тым ліку і Дзяржгандлем, якія ня выконваюць дагавораў.

Белдзяржгандаль павінен згодна дагавору загатовіць 7 тыс. пуд. шчаціны. Аднак яго контора пакуль яшчэ нічога не зрабіла ў гэтых адносінах. Смаленская контора Дзяржгандлю напрыклад, тэлеграфавала, што яна мае 1700 пудоў шчацінага сырцу, а калі прыехалі рабіць прыёмку, то не аказалася ні фунта.

Слабы тэмп паступленьня с.-г. падатку.

Патрэбны рашучыя меры да 100-проц. спагнаньня плацяжоў.

(Ліст з Гомелю).

У бягучым 1928 г. с.-г. падатак паступае горш, чым у мінулым годзе. Па пляне на 1-е студзеня павінна было паступіць 80 проц. падатку. Гэта значыць, 859 тыс. руб., а пакуль што паступіла толькі 665.000 руб., што складае 62 проц.

Слаба праводзілася праца сельсаветамі. Так было, зразумела, ня ўсюды, але ў шмат выпадках гэта мела месца. І гэта мела ўплыў на ход усёй кампаніі.

Асабліва зацягнулася праца па раёнах з шматлюдным насельніцтвам, абслугоўваньне якога было невыстарчальным за адсутнасьцю патрэбнага кадру працаўнікоў.

Нездавальняючымі вынікі кампаніі неабходна лічыць па Веткаўскім, Гомельскім, Рэчыцкім і Хойніцкім раёнах. Але наогул няма раёнаў, якія-б сваё заданьне выканалі па ўсе 100 проц.

Каб узмацніць паступленьне с.-г. падатку, пленум акрвыканкому пастанавіў у сьнежні месяцы прымаць прымусовыя меры да тых, хто да тэрміну ня ўнёс с.-г. падатку. Гэта навінна было да 15-га студзеня даць ня менш 90 проц. заданьня. Тэрмін канчаецца, а па маючыхся весткам выканаьне не дасягнула таго разьмеру які павінен быў быць выкананы. Па пастанаўленьні прэзыдыуму акрвыканкому, у раёнах вядзецца ўзмоцненая работа па спагнаньні нядоімак па с.-г. падатку і па другіх відах плацяжоў, напрыклад, запазычанасьці п землябудаўніцтве, па непадатковы фондах (аренда садоў, сенажаці інш.), запазычанасьці па насенных пазычках і інш. В. З.

Падатковы цяжар працоўных зьмяншаецца.

Год таму назад Наркамфін СССР правёў рэформу падаходнага падатку, асноўнае значэньне якой заключалася ў тым, каб звольніць ад асноўнага падаходнага падатку вялізную колькасьць найбольш бедных груп насельніцтва. Сумы, якія спаганяліся ад падатку з беднякоў, аказваюцца вельмі нязначнымі, а збор іх быў зьвязан з вялікай і дарагой работой. У выніку гэтае рэформы агульны лік плацельшчыкаў падаходнага падатку з 2.796 тысяч чалавек у 1925-26 годзе знізіўся ў 1926-27 г. да 1.541 тысячы чалавек, г. зн. на 1.344 тысячы чалавек, або на 48,1 проц. Інакш кажучы, саматужнікі-адзіночкі, дробныя рамясьніні, возчыкі, ніжэйшыя групы рабочых і служачых выйшлі з-пад абкладаньня. Тым ня менш, дзяржава ня мае ад гэтага страты, бо падаходны падатак у большай сваёй частцы разьмяркован сярод заможных груп насельніцтва.

Зараз працоўныя па найме, якіх налічваецца 629.000 чал., у агульнай суме ўносяць падатку 11,4 мільёнаў рублёў. Сярэдні разьмер падатку для гэтай групы плацельшчыкаў не перавышае 18 руб. у год, пры сярэднім прыбытку ў 1.512 руб. Інакш кажучы, падатак складае ўсяго 1,2 проц. прыбытку.

Другая група плацельшчыкаў падаходнага падатку—працоўных не па найме—выплачвае ўжо значна больш. Усяго іх налічваецца 418 тысяч, пры чым сума падатку складае 18,4 мільён. руб., пры сярэднім прыбытку ў 1.186 руб. Сярэдні аклад падатку па гэтай групе складае каля 44 руб. у год. Такім чынам, гэта група плацельшчыкаў выплачвае прыблізна 3,7 проц. свайго прыбытку.

Найбольшая-ж частка падатку прыпадае на найбольш заможную групу непрацоўнага насельніцтва. Лік плацельшчыкаў гэтае групы амаль у два разы меншы, чым першай групы—іх налічваецца ўсяго 383 тыс. чал. Але сума падатку, які яны выплачваюць, амаль у 10 раз большая ад сумы падатку, які выплачваюць рабочыя і служачыя. У 1926-27 г. гэта група выплаціла больш 111 мільён. руб. падатку пры сярэднім прыбытку ў 2.471 руб. Сярэдні аклад падатку гэтае групы складае 290 руб. У адносінах да агульнага прыбытку гэты падатак складае 11,7 проц.

З паданых лічб відаць, што рэформа поўнасьцю сябе апраўдала. Яна звольніла ад абкладаньня вялізныя масы маламоцных плацельшчыкаў і пераложыла цяжар абкладаньня на найболш заможныя клясы насельніцтва. У той-жа час агульная сума падатку, якую атрымлівае дзяржава, ад гэтага ня зьменшылася.

Зараз, у падаходны падатак уводзяцца новыя зьмены, якія зноўтакі зьяўляюцца значнаю палёгкаю для рабочых і служачых. Да гэтага часу працоўныя па найме абкладаліся ў бягучым годзе па заработку, які яны мелі летась. Дапусьцім, што рабочы зарабіў 2.000 руб. у год. З гэтае сумы ён павінен быў плаціць падатак у працягу наступнага году. Але справа ў тым, што ў наступным годзе заработак яго мог скараціцца напалову, і, такім чынам, аплата падатку за мінулы год была для яго вялікай. Апрача таго, самая тэхніка абкладаньня прыбытку рабочых і служачых па заработку мінулага году пры неабходнасьці ўлічваць вылічэньні і г. д., была надзвычайна складаную, вяла да розных памылак і дорага каштавала дзяржаве.

З 1-га студзеня 1928 г. такі парадак абкладаньня рабочых і служачых саступае месца больш простаму, з пункту гледжаньня тэхнікі, і больш справядліваму, з пункту гледжаньня абкладаньня. Рабочыя і служачыя будуць абкладацца па прыбытку ня мінулага, а бягучага году. Замест гадавога неабкладаемага мінімуму, устанаўляецца месячны неабкладаемы мінімум. Прафэсыянальныя і партыйныя ўносы з абкладаемага прыбытку ня будуць вылічвацца, але, замест гэтага будуць зьмяшацца стаўкі падатку. Прыбыткі-ж рабочых і служачых не ад заработнае платы, а ад іншых крыніц будуць абкладацца асобна і не па месячным, а па гадовым прыбытку. Заработная-ж плата будзе абкладацца толькі ў тым выпадку, калі яна ў працягу месяца перавысіць у мясцовасьцях 1-га поясу 100 руб., другога поясу—90 руб., 3-га—80 руб. і 4-га—75 руб. у месяц.

У тых выпадках, калі рабочыя і служачыя атрымліваюць заработную плату на рабоце, або службе ў некалькіх мясцох, заработная плата па кожным у паасобку месцы работы і службы, калі яна не перавышае паказаных разьмераў, не падлягае абкладаньню, хоць-бы агульная сума зарплаты ў [illegible] месцох работы або службы перавысіла гэтыя разьмеры. Калі-ж заработная плата перавышае вызначаны мінімум, дык, незалежна ад таго, ці атрымліваецца яна з некалькіх месц службы або з аднаго, кожнае атрыманьне грошай абкладаецца асобна. Інакш кажучы, калі рабочы атрымлівае 315 руб. па 105 руб. у трох мясцох службы, дык ён на ўсіх службах будзе абкладацца са 105 руб., а не з 315 руб. Гэта мае вялікае значэньне, бо пры прагрэсыўнасьці ставак падатку, калі-б рабочы абкладаўся з 315 руб., дык ён павінен быў-бы заплаціць значна больш, чым ён заплаціць, будучы абкладзен у 3-х мясцох з акладу ў 105 руб.

Ня менш важную ільготу прадстаўляе новае палажэньне аб падаходным падатку па сямейным становішчы. Па старым палажэньні рабочыя, служачыя і дзяржаўныя пэнсіянэры з абкладаемым падаткам ня звыш 4.000 руб. у год пры наліччы ўтрыманцаў больш 2-х асоб, карысталіся скідкаю з акладу падатку ў разьмеры 25 пр. Паводле новага палажэньня рабочыя, служачыя і пэнсіянэры, якія маюць на ўтрыманьні 3-х асоб, атрымліваюць скідку ў 25 проц., а плацельшчыкі, якія маюць на ўтрыманьні больш 4-х асоб, атрымліваюць ужо скідку ў разьмеры 1/3 акладу падатку.

Такім чынам, новае палажэньне аб падаходным падатку значна зьмяняецца ў лепшы бок, абкладаньне рабочых і служачых зьмяншаецца, паслабляецца цяжар падатку і робіць яго больш справедлівым для незможных груп насельніцтва.

У прэзыдыуме ЦСПСБ.

(На пасяджэньні 12-га студзеня).

Павялічэньне пая ў рабочай каапэрацыі.

Па гэтым пытаньні прэзыдыум прызнаў **сваячасовым і неабходным павялічыць пай ў рабочай каапэрацыі да 15 руб.**

Для папулярызацыі пераходу на 15-ці руб. пай, а таксама для ўзмацненьня збору паёў прызнана неабходным шырока скарыстаць сучасную справаздачную перавыбарную кампанію. Нізка—аплачваемым групам пайшчыкаў будзе прадастаўлена доўгатэрміновае адтэрмінаваньне. Белрабсэкцыі і АТЭ ЦСПСБ даручана дэтальна распрацаваць гэтае пытаньне

17.000 рублёў на культурную працу.

Прэзыдыум ЦСПСБ зацьвердзіў выдатковую частку каштарысу ЦСПСБ і АСПС на культпрацу ў 1928 г. у суме 17.348 р.

У плян працы культаддзелу ЦСПСБ уключана арганізацыя курсаў клюбных і бібліятэчных працаўнікоў, сэмінара для працаўнікоў юнсэкцыі, культурнае абслугоўваньне беспрацоўных і г. д.

Агляд клюбаў гор. Менску.

Ад 20-га студзеня па 20-га лютага пастаноўлена правесьці па гор. Менску агляд рабочых клюбаў. Задача агляду — прыцягнуць увагу членаў прафсаюзаў і ўсёй грамадзкасьці да працы клюбаў; уцягнуць новыя групы рабочых і работніц у клюбы, палепшыць пастаноўку масавай працы, выявіць ці зьяўляюцца клюбы месцам адпачынку і г. д.

Для правядзеньня агляду вылучаюцца спэцыяльныя тройкі.

Пасьля агляду адбудзецца гарадзкая канфэрэнцыя клюбных працаўнікоў і членаў клюбаў, на якой будуць падагулены вынікі агляду.

Палепшэньне быту рабочых.

На гэтым-жа пасяджэньні было разгледжана пытаньне аб парадку скарыстаньня адлічэньняў ад фонду палепшэньня быту рабочых на рабочае жыльлёвае будаўніцтва. Ухвалена наступнае рашэньне: 75 проц. ад фонду палепшэньня быту рабочых, а таксама і крэдыты, якія адпускаюцца для прамысловасьці па лініі Цэкамбанку, навіны быць выкарыстаны выключна на прамысловае рабочае жыльлёвае будаўніцтва.

Пастаноўлена дапусьціць у 1928 г. перадачу жыльлёвай каапэрацыі 20 проц. сум фонду палепшэньня быту рабочых, якія адпускаюцца на жыльлёвае будаўніцтва.

Плян падрыхтоўкі сьвяткаваньня 10-годзьдзя Чырвонай арміі

1. У горадзе.

1. Правядзеньне раду гутарак у клюбах, чырвоных куткох пры жактах, прадпрыемствах і ўстановах па гісторыі Чырвонай арміі і высьвятленьне пытаньняў па ўзмацненьні абароны краіны.
2. Папаўненьне бібліятэк вайсковаю літаратурай.
3. Выстаўка літаратуры і матар'ялаў на гісторыі Чырвонай арміі.
4. Вечары ўспамінаў і ўшанаваньня гэроеў і ўдзельнікаў і грамадзянскай вайны.
5. Экскурсіі ў падмаскоўныя і сутаварыскія часьці. Ухвала канкрэтных правоў на сыстэматычнай матар'яльнай дапамозе для сутаварыскіх часьцей.
6. Вярбоўка рабочых і служачых у рады Асоавіяхіму.
7. Справаздачныя даклады на сходах членаў саюзаў працаеьветы і прац. мастацтва сумесна з чырвонаармейцамі аб выніках культпэфства.
8. Сіламі працаўнікоў мастацтва і клюбаў падрыхтаваць рад пастановак у тэатрах і клюбах. Паркамасьветы падабраць адпаведны рэпэртуар.
9. У парадку культпэфства прыцягнуць сілы працаўнікоў мастацтва для ўдзелу ў юбілейных выстаўках.
10. З 15-га студзеня—перадача па радыё гутарак, успамінаў, канцэртаў і г. д.

2. У вёсцы.

1. Па лініі шэфтаварыства—выезды ў вёскі для ўдзелу ў арганізацыі сьвяткаваньня (правядзеньне агіткампаніі, абсталяваньне вайсковых куткоў і г. д.)
2. Выезды прадстаўнікоў чырвонаармейскіх часьцей у падшэфныя раёны.
3. Экскурсіі сялян і сялянак у чырвонаармейскія часьці, пасьля—справаздачы экскурсантаў на вясковых сходах.
4. Правядзеньне гутарак і дакладаў у хатах-чытальнях, нардамох і чырвоных куткох па гісторыі Чырвонай арміі.
5. Наладжаньне вечароў—успамінаў удзельнікаў грамадзянскай вайны і ўшанаваньне гэроеў грамадзянскай вайны.
6. Вярбоўка сялян у члены Асоавіяхіму і арганізацыі новых гурткоў.
7. Папаўненьне бібліятэк вайсковай літаратурай.
8. Утварэньне вайсковых гурткоў пры палітасьветных установах
9. Пасылка лістоў ад сялян сваім сваякам і земляком чырвонаармейцам.
10. Найменьне палітасьветных устаноў, плянаў і г. д. імёнамі мясцовых гэроеў, якія загінулі ў грамадзянскай вайне, з наступным зацьвярджэньнем АВК.

3. У школах.

1. Школьныя рапішнікі, ці вечары прысьвечаныя юбілею.
2. Спэцыяльныя заняткі, прысьвечаныя Чырвонай арміі.
3. Экскурсіі ў вайсковыя часьці.
4. Папаўненьне бібліятэк вайсковаю літаратурай.
5. Выпуск спэцыяльных насьценгазэт.
6. Увесьці выкладаньне вайсковых дысцыплін у старэйшых клясах сямігодак і тэхнікумах.

4. Мерапрыемствы па лініі саветаў.

1. Заслухаць даклады прадстаўнікоў вайсковых часьцей і распрацаваць мерапрыемствы па паляпшэньні чырвонаармейскага быту.
2. Вызначыць мерапрыемствы па палягчэньні кватэрнага крызісу сярод начскладу.
3. Дапамагчы гарнізонам, якія размешчаны ў невялікіх гарадох, у абсталяваньні клюбаў.
4. Ліквідаваць беспрацоўе сярод начскладу запасу.
5. Зрабіць праверку выкананьня савецкага законадаўства ў адносінах да сем'яў чырвонаармейцаў, інвалідаў, чырвоных партызан і дэмабілізаваных.
6. Правесьці рад гаспадарчых мерапрыемстваў у адносінах да сем'яў чырвонаармейцаў, галоўным чынам, беднаты (водпуск дроў, лесаматар'ялу, уключэньне ў плян землеўпарадкаваньня, крэдытаваньне па лініі каапэрацыі, каапэраваньне і г. д.).
7. Адчыніць каапэрацыйныя разьмеркавацелі пры вайсковых часьцях.
8. Беднядзяржкіно падабраць адпаведныя карціны для кіно, клюбаў і кіно-перасовак.

5. Друк.

1. Прапаганда ва ўсіх пэрыядычных выданьнях пытаньняў, зьвязаных з 10-ці годзьдзем Чырвонай арміі.
2. У адной з газэт правесьці праверку выкананьня савецкага законадаўства ў адносінах да сем'яў чырвонаармейцаў дэмабілізаваных, партызанаў і інвалідаў.
3. Правесьці агляд КСУ і вайсковых гурткоў.
4. Надрукаваць ліст для чырвонаармейцаў для адпраўкі дамоў.
5. Выдаць тры брашуры аб Чырвонай арміі на беларускай мове.

УВАГА: У гутарках належыць высьвятліць наступныя пытаньні:

„Як стваралася, узмацнялася і заявала Чырвоная армія, пачакоўшчына, дзянікінщына. Барацьба за Савецкую Беларусь.

Расійская контр-рэвалюцыя на службе сусьветнага імпэрыялізму.

Як капіталістычныя краіны падрыхтоўваюцца да вайны. У чым сіла Чырвонай арміі. Чырвоная армія на варце СССР. Савецкая грамадзкасьць і абарона Савецкага Саюзу".

МЕНСК

Аб 7-гадзінным працоўным дні на камунальных прадпрыемствах.

ЦП саюзу камунальнікаў Беларусі даручыла мысцовым саюзным арганізацыям прапрацаваць пытаньне аб пераходзе на 7-гадзінны працоўны дзень па камунальных прадпрыемствах.

У першую чаргу 7-гадзінны працоўны дзень мяркуецца правесьці па трамвайных прадпрыемствах—Віцебску, вадаправодных станцыях і мэханічных пральнях.

Да ліквідацыі Менскай конкі.

Па лініі пляц Волі-Пярэспа будуць курсаваць 5 вагонаў конкі састаянкай на пляцы Волі.

З атрыманьнем 8 новых аўтабусаў—2 з іх будуць пушчаны па рэйсу—пляц Волі—Ляхаўка і 2 аўтабусы—пляц Волі—Серабранка.

Льготы беднаце па страхоўцы.

У 1926-27 годзе Ўправаю Дзяржаўнага Страхаваньня БССР дана льгот на абавязковым акладным страхаваньні ў наступным разьмеры: у сельскіх мясцовасьцях зьнята страхоўкі ў парадку льгот на суму 356.556 рублёў, льготы даны 167.185 двароў або 20,6 проц. да ўсіх застрахаваных сялянскіх двароў; у гарадох зложана з беднякоў страхоўкі ў парадку льгот на суму 6.342 рублёў членам прафсаюзаў — 4.301 руб. Усяго дана ў 1926-27 годзе льгот на страхоўцы на суму 367.200 рублёў. Агульны процант льгот з кожным годам павялічваецца: калі ў 1924-25 годзе яны складалі 6,6 проц. да пачаткова налічанай сумы акладу, то ў 1926-27 годзе яны складаюць 12 проц.

Страхавыя плацяжы.

Згодна дадатковых даных, па акладным сельскім страхаваньні, па ўсёй БССР паступіла 1.531.051 р., што складае 70 проц. заданьня на першы тэрмін.

Нядоімкі спаганяюцца яшчэ горш. Спагнана ўсяго 19,1 проц. нядоімак, замест 100 проц. да вызначана тэрміну.

У гэтым годзе павінна паступіць яшчэ нядоімак і плацяжоў па сельскім акладным страхаваньні 2.869.000 р.

Выраб паперы ў Беларусі.

У 1927-28 г. фабрыкамі Белпапертресту будзе выраблена 19.600 тон розвай паперы замест 18.400 тон у мінулым годзе. Намечана пашырэньне Дабрускай папяровай фабрыкі, на якой ўстанаўляецца шостая машына.

Новыя машыны для калбаснай фабрыкі.

Белмясгандаль атрымаў з-за гранцы рад новых машын. Сярод іх—машына для вырабу чайнай каўбасы і сасісак, саларэзка і г. д. Усе машыны ўстаноўлены на калбасной фабрыцы, што значна павялічвае яе прапускную здольнасьць. Адначасова на фабрыцы ўстаноўлены два электраматоры ў 21 конскую сілу замест існаваўшага нафтавога рухавіка.

Цэмэнт для Асінстрою.

Пастрой заключыў дагавор з мэталятрестам Цэнтральнага раёну на пастаўку ў працягу студзень—жнівень м-цаў для будаўніцтва Ворша—Выкрыца 15 тыс. бочак цэмэнту.

ВСНГБ узбудзіў хадайніцтва перад Камісарыятам Шляхаў Зносін аб ужываньні пры перавозцы гэтага грузу ільготнага чыгуначнага тарыфу.

Адчыненьне настаўніцкіх курсаў.

Наркамрацы і Паркамасьветы БССР адкрываюць для беспрацоўных разумовай працы настаўніцкія курсы. Мэта курсаў—падрыхтаваць з беспрацоўных, якія маюць сярэднюю асьвету, настаўнікаў для чатырохгодак, лікпунктаў і школ малапісьменных.

Курсы разьлічаны на 6 месяцаў—з 1-га лютага па 1-га ліпеня. Маркуецца прыняць на курсы 100 слухачоў, якія будуць забясьпечаны навучальнымі падручнікамі і прыладамі. Пасьля тэарытычнай падрыхтоўкі, слухачы будуць адбываць практыку ў школах, на што будзе зьвернута асаблівая ўвага.

Прыём заяў пачнецца з 16-га студзеня ў памяшканьні 2-й сямігодкі (Ленінская, 21) штодня ад 6-ці да 9 гадзін вечару.

Залічэньне на курсы будзе рабіць спэцыяльная камісія з прадстаўнікоў Наркамрацы, Паркамасьветы, саюзу працасьветы і інш.

На акруговай канфэрэнцыі яўрэйскіх настаўнікаў.

Другі дзень працуе яўрэйская акруговая канфэрэнцыя настаўнікаў.

З дакладам аб культурных задачах настаўніцтва ў нашай краіне выступіў сакратар Менакругкому КП(б)Б тав. Акулік. Ён спыняецца на працы партыі сярод інтэлігэнцыі.

У спрэчках па гэтым дакладу выступала 9 чалавек, галоўным чынам настаўнікі з месц.

З дакладам аб працы інспэктарыяту нарасьветы выступіў т. Эфран.

Усяго па Меншчыне ёсьць 20 яўрэйскіх сямігодак, з іх у Менску 12 і астатнія па раёнах. Яўрэйскіх чатырохгодак ёсьць 25.

У яўрэйскіх школах навучаецца 4.058 дзяцей, а ў агульных школах 2.660 яўрэйскіх дзяцей.

Выступаўшыя з месц таварышы адзначалі, што вячэрнія школы па мястэчках ня маюць свайго бюджэту. Падручнікі для 2-га канцэнтру маюцца ў невыстарчальнай колькасьці. Па некаторых мястэчках чатырохгадовыя яўрэйскія школы па магчымасьці трэба абарочваць у сямігодкі.

З прывітаньнем ад народнага камісарыяту Украіны выступіў т. Рапо, які адзначыў рост яўрэйскіх сямігодак і прафтэхшкол на Украіне.

За дзень.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА ЮРЫДЫЧНЫХ КАНСУЛЬТАЦЫЙ. Прэзыдыум ЦСПСБ прызнаў неабходным склікаць ў пачатку лютага м-ца ўсебеларускую нараду працаўнікоў прафсаюзных юрыдычных кансультацый.

МАЛЮНКІ З ЭРМІТАЖУ. Ленінградзкі музэй Эрмітаж перадае Беднядзяржмузэю 35 малюнкаў Італьянскіх, Фламандзкіх і Галяндзкіх мастакоў.

КАНФЭРЭНЦЫІ ПАЛІТАСЬВЕТПРАЦАЎНІКОЎ. Закончыліся канфэрэнцыі палітасьветпрацаўнікоў Койданаўскага, Узьдзенскага, Заслаўскага і Капыльскага раёнаў. Нарады выказаліся за ўзмацненьне антырэлігійнай прапаганды.

ДВА ВАГОНЫ ЛІМОНАЎ ДЛЯ БССР. Белсельсаюз атрымаў з заграніцы два вагоны лімонаў, якія будуць ім разасланы па месцы.

ВЕЧАР 10-ГОДЗЬДЗЯ САЮЗУ САЎГАНДАЛЬСЛУЖАЧЫХ. Сёньня а 8 гадзіні увечары ў клюбе Саўгандальслужачых адбудзецца юбілейны вечар прысьвечаны 10-годзьдзю саюзу Саўгандальслужачых.

ІЛЬГОТЫ КУЛЬТУРНЫМ ГАСПАДАРКАМ. Акрвыканком узбудзіў хадайніцтва перад Саўнаркомам аб ввальненьні ад с.-г. падатку культурных саўхозаў Менсельпраму.

Здарэньні.

— **Напад хуліганаў.** 8 студзеня ўвечары за ўрочышчам „Тры карчмы" вядомыя хуліганы Алісевіч, Жыдовіч і Мелін зрабілі нападкі на некалькіх праходзячых грамадзян і пабілі іх. Хуліганы крымінальным вышукам затрыманы.

— **Выкрыцьцё пакраж.** Крымінальны вышук выкрыў пакражы, якія былі зроблены на гатых дніёх на Гандлёвай вул., 12, і Біржавым завулку, дом № 8. Злодзеі затрыманы. Украдзеныя рэчы знойдены.

— **Пабілі лясьніка.** Лясьнік Глускага лясьніцтва Белячкоў затрымаў двух парубчыкаў. Апошнія нанеслі яму калом цяжкія параненьні і схаваліся. Паранены лясьнік быў падабраны праходзячымі сялянамі.

— **Пакража.** На Вялікай-Татарскай вул., дом № 6, невядомымі злачынцамі зроблена пакража розных харчовых прадуктаў на 30 рублёў.

— **На месцы злачынства.** Злодзеі, узламаўшы краты, увайшлі ў краму Асінаўскага каапэратыву і хацелі зрабіць пакражу. Злодзеі былі заўважаны вартаўніком, які супольна з загадчыкам крамы затрымаў іх на месцы злачынства.

— **Возчык-грабежнік.** Крымінальны вышук затрымаў возчыка А. Рыбалкоўскага, які абрабаваў на Чэрвенскім тракце С. Матусевіча. Грабежнік пазнаны пацярпеўшым.

— **137 рублёў.** У магазыне па Ленінскай вул., № 9, у К. Баскінай украдзена з кішэні 137 рублёў.

— **Пакража цэглы.** Возчык гарбарні „Бальшавік"—Шандлер украў 300 штук цэглы, якая належыць гарбарні. Шандлер прыцягваецца да адказнасьці.

КІНО І ГЛЯДАЧ.

Фільм---у клюбы.

У чацьвер у клюбе гарбароў адбыўся дыспут аб кіно, арганізаваны Белдзяржкіно. З дакладам аб дзейнасьці Белдзяржкіно выступіў тав. Кацнэльсон.

— Зацікаўленасьць кіно,—гаворыць тав. Кацнэльсон,—у горадзе вялікая. З кожных 100 чалавек гарадзкога насельніцтва 90 чалавек наведваюць кіно.

Кіно заклікана дапамагаць ажыцьняўленьню сацыялістычнай культуры. Кіно зьяўляецца магутным сродкам прапаганды. Добрыя рэвалюцыйныя карціны выхоўваюць, натхняюць, узьнімаюць энтузіазм. Кіно больш моцны сродак для прасоўваньня культуры ў масы, чым тэатр, бо кіно можна паказаць адначасова ўсюды. Партыя зварочвае шмат увагі на кіно. Белдзяржкіно за апошні час шырока разгарнула працу па забесьпячэньні горада і вёскі кіно-карцінамі.

Раней мы мелі па БССР да 20 клюбаў, якія мелі кіно-ўстаноўкі. Цяпер мы іх давялі да 90. Вясковая кіна-работа таксама пастаўлена ў нас нядрэнна і па абслугоўваньні вёскі кіно-перасоўкамі і карцінамі БССР стаіць на першым месцы ў Саюзе. Рабочага глядача мы абслугоўваем па лініі клюбнай і тэатральнай. Мы зрабілі кіно „Культура" даступным па сваіх цэнах для рабочых. Але ня гледзячы на гэта, рабочы глядач мала наведвае ня клюбныя сэансы. Грамадзкая думка павінна дапамагчы справе кінофікацыі рэспублікі. Белдзяржкіно ў бліжэйшы час распачынае дэманстраваць навуковыя карціны адзін раз у тыдзень ва ўсіх кіно г. Менску.

Даклад тав.. Кацнэльсона выклікаў гарачыя спрэчкі.

Тав. Гурвіч, рабочы заводу „Бальшавік", гаворыць:

Камэрцыйнае кіно нас не здавальняе, карціны ідуць такія, што рабочых яны ня могуць зацікавіць. Клюб рабочыя наведвалі-б ахвотна але фільмы, якія ідуць ў клюбах, трапляюць туды праз 3-4 месяцы пасьля таго, як іх ставяць ў кіно, дый у такім дрэнным выглядзе, што на іх нельга глядзець. Неабходна рабочыя карціны перш за ўсё ставіць ў клюбах.

Тав. Лейфэр—рабочы шчацінной фабрыкі кажа:

— У клюбе вывешана афіша: ідзе карціна ў 6-ці частках. Калі прыходзіш глядзець, табе замест 6 частак паказваюць 25—30 частак. Гэта таму, што карціца рвецца. Кіно ў першую чаргу павінна абслугоўваць добрымі карцінамі рабочыя клюбы.

Спрэчкі выклікалі гарачую зацікаўленасьць з боку аўдыторыі. Усе выступаўшыя таварышы зазначалі на неабходнасьць лепшага забесьпячэньня клюбаў кіно-карцінамі.

Спрэчкі зацягнуліся да позьняга вечару.

Дыспут ў клюбе Ільліча.

Учора ў клюбе чыгуначнікаў імя Ільліча адбыўся дыспут, арганізаваны Белдзяржкіно на тэму: „Кіно і рабочы глядач". З вялікім дакладам аб дзейнасьці Белдзяржкіно выступіў тав. Галкін. Пасьля дакладу была прадэманстравана новая фільма вытворчасьці Белдзяржкіно „Кастусь Каліноўскі". Пасьля дэманстрацыі кіно былі спрэчкі аб гэтай карціне.

Карціна выклікала вялікую зацікаўленасьць з боку рабочых.

Куток краязнаўцы.

Моладзь і краязнаўства.

Вельмі значны процант нашых краязнаўцаў—гэта моладзь: студэнты вышэйшых навучальных устаноў, рабфакаўцы, пэдтэхнікумоўцы, студэнты Горацкай с.-г. акадэміі, Віцебскага мастацкага тэхнікуму, вучнёўская моладзь па школах, маладыя настаўнікі і г. д.

Усе яны працуюць як па тэарытычным краязнаўстве ў сваіх інстытуцыях, таксама па практычных досьледах у краязнаўчых таварыствах у округах, раёнах і вёсках.

Нават у Ленінградзе пры універсытэце студэнты-беларусы маюць свой навукова-дасьледчы гурток, у якім працуюць па дасьледваньні Беларусі—этнографы, лінгвістыя, эканамістыя і г. д. Кожны год у часе летніх вакацый яны наведваюцца з Ленінграду ў розныя округі Беларусі з мэтай рэгістрацыі настойных краязнаўчых досьледаў.

Апрача лекцый і кніг, кожны з вучнёйскай моладзі практыкуецца на сваёй спэцыяльнасьці на жывых краязнаўчых досьледах. Для гэтага моладзь мае вельмі багатую бібліятэку—жывыя ілюстрацыі нашага краю на яго прасторах.

Аб'ектаў краязнаўчых досьледаў вельмі багата і яны вельмі рознастойны—ад археалёгічна-гістарычных раскопак, зьбіраньня матар'ялаў народнай творчасьці да сучаснай сельскай гаспадаркі, да абсьледваньня нашай саматужнай прамысловасьці і фабрык.

Наша моладзь пазьбірала па вёсках шмат слоў жывой беларускай мовы, шмат нумароў народных песень, казак і інш., пазьбірала па глухіх кутках Беларусі ўзоры народных вырабаў—разьбярства, тканін і г. д. Студэнты Віцебск. мастацкага тэхнікуму кожнае лета робяць на вёсках краязнаўчыя зарысоўкі беларускага арнамэнту, народных тыпаў, краявідаў і інш. За апошнія два гады зроблена шмат досьледаў па народнай мэдыцыне, абсьледвана санітарна - гігіенічнае становішча, сацыяльныя хваробы па некаторых гарадох і вёсках. Вывучаецца на мясцох наша звычаёвае права, новы быт, сацыяльныя ўзаемаадносіны і клясавае расслаеньне на вёсцы, дасьледуюцца: нашая сельская гаспадарка, лясы, ладзяцца экспэдыцыі і экскурсіі з мэтай раскопак старасьвецкіх помнікаў, дасьледуюцца нашы фабрыкі і заводы.

Такім чынам нашы школы выхоўваюць з моладзі багатую зьмену дасьледчыкаў-краязнаўцаў. Ужо ў працягу апошніх трох гадоў мы бачым плёны гэтай працы. Возьмем для прыкладу хоць-бы толькі «Наш Край», на старонках якога надрукована некалькі дзесяткаў розных навукова-дасьледчых прац маладых краязнаўцаў. А колькі іх ёсьць яшчэ ненадрукаваных ды яшчэ толькі ў рэдакцыі «Нашага Краю», а ў многіх навукова-дасьледчых установах нашай Рэспублікі.

У сувязі з новым будаўніцтвам ва ўсіх галінах нашай гаспадаркі і культуры павялічваецца ў моладзі імкненьне да пазнаваньня свайго краю, бо да Кастрычнікавай рэвалюцыі Беларусь мела дасьледваецца, з калі і рабіліся такія-сякія досьледы, дык з тэндэнцыйнымі мэтамі — давесьці, што тут «истинно русский Северо-Западный край». Дык вось і ня дзіва, што сярод моладзі імкненьне да пазнаваньня саміх сябе, вытворчых сіл і багацьцяў свайго краю вырасла да такіх памераў.

У выніку праца вялікіх кадраў моладзі ў краязнаўчых арганізацыях дасягне дзьвюх мэт:

1) выгадуе па практычных досьледах вялікую сям'ю маладых навуковых працаўнікоў;

2) выявіць усе магчымасьці новага гаспадарча-культурнага будаўніцтва Савецкай Беларусі.

З. Бядуля

Ня горш, як у людзей.

ЧАШНІКІ. (Уласн. кар.). Наша раённае таварыства краязнаўства арганізавалася ў траўні месяцы 1925 г. Краязнаўчая справа ў нашым раёне была зусім новай і таму таварыству прышлося перажыць параўнаўча доўгі арганізацыйны пэрыяд. У пачатку ў склад таварыства ўваходзіла 14 членаў.

Цяпер таварыства мае 53 члены, пераважная большасьць іх—настаўніцтва. У склад членаў уваходзяць 5 членаў КП(б)Б і 4 ЛКСМ.

У кастрычніку месяцы 1925 г. у краязнаўчую працу ўцягваецца вучнёўская моладзь і пры мясцовай школе-сямігодцы ўтвараецца краязнаўчы гурток, які цягер мае 35 членаў і падзяляецца на 3 сэкцыі: прырода-геаграфічную, грамадзка-эканамічную і культурна-гістарычную.

За час існаваньня таварыства адбылося 6 краязнаўчых канфэрэнцый і агульных сходаў і 19 пасяджэньняў праўленьня.

Даволі вялікую працу таварыства правяло у справе зьбіраньня слоўнікавага матар'ялу. Так, у 1926 г. членамі таварыства і школьнага гуртка было сабрана 2.800 картак-слоў, з іх 750 яўрэйскіх. Частка іх скарыстана для „Віцебскага краёвага слоўніка", а рэшта адасланы ў Слоўнікавую Камісію пры Інбелкульце. Ня мала сабрана і фольклёрнага матар'ялу: ёсьць сабрана і апрацавана да 900 вусных твораў. Яны адасланы ў ЦБК. Збор вусных твораў вядзецца і цяпер з мэтай выданьня асобнага зборніку. Распачатая праца па ўкладаньні гэрбарыя мясцовых расьлін дала добрыя вынікі: ёсьць ужо сабрана да 200 экз. мясцовых расьлін,

Таварыства мае шмат экспанатаў, як розныя віды папяровых грошай (да 200 экз.), манэт розных часоў (45 экз.), дыяграмы, фатаграфічныя здымкі, прылады каменнага веку і інш. Такім чынам, ёсьць магчымасьць залажыць пачатак арганізацыі раённага музэю, але адсутнасьць памяшканьня не дае магчымасьці гэтага зрабіць, Зараз праўленьнем падымаецца перад РВК пытаньне аб падшуканьні адпаведнага будынку для музэю,

У сучасны момант праца таварыства вядзецца ў кірунку вучоту помнікаў старыны і мастацтва, апісаньня паселішчаў і саматужных промыслаў, зборау геаграфічных назваў, арганізацыя гурткоў у сельсаветах.

Распачынаецца таварыствам праца і па вывучэньні раёну, згодна заданьняў акруговага праўленьня і ЦБК. Дзеля гэтага вылучан Іванаўскі сельсавет, як ударны.

Я. В.

Вузьдзенцы не адстаюць.

ВУЗДА. (Уласн. кар.). Краязнаўчы рух у Вузьдзенскім раёне (Меншчына) распачаўся з 1923 года. Першай кіраўнічай арганізацыяй па краязнаўстве зьяўлялася краязнаўчае бюро. Ня гледзячы на ніякія ўмовы працы ўсё-ж такі шырока была разгорнута праца на краязнаўстве.

У 1925 годзе на ініцыятыве бюро было арганізавана раённае краязнаўчае таварыства „Досьлед", якое наладзіла цесную сувязь з ЦБК пры Інбелкульце. Краязнаўчае таварыства распачало працу па вывучэньні этнаграфіі, эканомікі, гісторыі і прыроды раёну. Поруч з гэтым распачаўся шырокі збор старасьвецкіх манэт, гістарычных паданьняў аб рэвалюцыі 1905 году і аб польскім паўстаньні ў 1863 годзе.

У часе экскурсіі ў мястачку Магільны былі знойдены часткі гліняных пасудаў, арыгінальныя арнамэнты, каменнае долата дагістарычнага чалавека (палеаліт) і інш. Цяпер распачата шырокая праца на зборы фольклёру, у выніку чаго складзены рукапісны зборнік, які зьмяшчае больш як 200 розных песень. Зьбіраюцца беларускія паясы, узоры тканін, а таксама вучнямі сямігодкі зроблены для музэю мадэль для апрацоўкі ільну і вырабу тканіны.

У працягу 1925 году вяліся назіраньні за птахамі, навальніцамі, напрамкам ветру, сьнегавым насьцілам і інш. Зроблена шмат дыяграм, якія сьведчаць аб разьвіцьці прамысловасьці і сельскай гаспадаркі раёну.

Арэндная плата за муніцыпалізаваныя будынкі.

Паводле праекту пастановы ЦВК і СНК, унесенага Дзяржплянам у СНК, арэндная плата за муніцыпалізаваныя будынкі, прызначаныя для жыльля і здачы пад кватэры, устанаўляецца гарадзкімі і местачковымі саветамі, а там, дзе іх няма, выканаўчымі камітэтамі ў залежнасьці ад даходнасьці будынкаў. У арэндную плату ўключаюцца: пагашэньне кошту амартызацыі будынкаў і процанты на будаўнічы кошт будынку.

Гадавая арэндная плата за муніцыпалізаваныя будынкі жылога назначэньня ўстанаўляецца для пагашэньня кошту амартызацыі будынкаў у разьмеры ад 1 да 1,5 проц. (у залежнасьці ад будынкаў—драўляныя ці каменныя) будаўнічага кошту будынку, які вылічаны з надлікам узносу па сярэднім для данага гораду будаўнічым кошце адзінкі плошчы. З домаўладаньняў, у якіх даход з адзінкі жылое плошчы не перавышае $^3/_4$ устаноўленай у даным горадзе асноўнай кватэрнай таксы, г. зн. кошту эксплёатацыі і амартызацыі адзінкі жылой плошчы, арэндная плата спаганяецца ў разьмеры $^1/_2$ кошту амартызацыі. Домаўладаньні з даходам на адзінку жылое плошчы ня больш $^1/_2$ асноўнай кватэрнай таксы звальняюцца ад арэндной платы.

З муніцыпалізаваных будынкаў, у якіх чысты даход з адзінкі жылой плошчы перавышае ўстаноўленую ў даным горадзе асноўную кватэрную таксу, у складзе арэндной платы спаганяюцца таксама і процанты на будаўнічы кошт будынкаў у відзе адлічэньняў домакіраваньням лішкаў даходаў. Гэтыя адлічэньні ўстанаўляюцца пастановаю гарадзкіх і местачковых саветаў або адпаведных выканаўчых камітэтаў у разьмеры ад 40 да 60 проц. в сумы лішкаў, не перавышаючых $^1/_2$ асноўнай кватэрнай таксы і ў разьмеры 70 проц. з астатняй сумы лішкаў.

Гэтая пастанова, паводле праекту, не пашыраецца на будынкі, цалкам занятыя ўстановамі, якія бяруць на сябе рамонт і ўтрыманьне будынку за свой кошт і якія не эксплёатуюць будынкі праз здачу памяшканьняў у субарэнду. Калі ў складзе будынкаў, якія здаюцца ў арэнду, ёсьць гандлёвыя, гандлёва-прамысловыя і складачныя памяшканьні і калі арэндатарамі будынкаў зьяўляюцца дзяржаўныя ўстановы і прадпрыемствы, каапэрацыйныя, прафэсыянальныя і савецкія грамадзкія арганізацыі, то гэтыя памяшканьні павінны здавацца гэтым арэндатарам разам з жылымі памяшканьнямі, пры гэтым арэндная плата за гэтыя памяшканьні спаганяецца па тарыфе—мінімум за адзінку плошчы паводле асобнага закону.

Кватэрна-арэндныя каапэрацыйныя таварыствы маюць пераважнае права аренды муніцыпалізаваных будынкаў, у якіх жывуць члены таварыства, а таксама права аднаўленьня дагавору найму перад іншымі прэтэндэнтамі. Часьць даходаў ад гандлёвых, гандлёва-прамысловых і складачных памяшканьняў, якая перавышае ўстаноўлены ў даным горадзе тарыф—мінімум на адзінку плошчы паступае ў арэндную плату, як адлічэньне лішкаў даходаў.

НК Унутраных Спраў па ўзгадненьні з НК Фінансаў даручаецца выдаць інструкцыю па ўжываньні гэтай пастановы.

А. М.

ДЗЕЦІ І ЭКРАН.

Замала ўсё такі мы зварачаем увагу на выхаваньне нашага маладога пакаленьня—дзяцей і падросткаў. Тым ня менш нам трэба выхаваць яго моцным фізычна, з здаровай псыхікай. Дзеля гэтага патрэбна праводзіць гэтае выхаваньне ў належным кірунку, трэба адхіляць усякія шкодныя ўплывы, каб яны ня дзейнічалі адмоўна на фізычны стан і на псыхіку падрастаючага пакаленьня,

Кіно, побач з усім тым станоўчым, што яно дае юнаму глядачу, у некаторай долі прышчэпвае яму і шкодныя навыкі. Нельга, зразумела гэтага сказаць пра ўсе карціны, тут трэба разумець фільмы, дзе пераважаюць матывы каханьня, якое часамі ў фільмах мяжуе з распустай, а таксама фільмы авантурна-прыгодніцкія, як „Сьпід", „Багдадзкі злодзей" ды іншае амэрыканскае мордабойства, якое яшчэ на нашых экранная часта можна спаткаць.

Ня зусім правільна думаюць тыя, якія гавораць, што кіно—гэта ні больш ні менш, як забава, дзе можна правесьці цікава час. Кіно адыгрывае вялікую ролю ў выхаваньні моладзі і можа прынесьці як вялікую карысьць, так і вялікую шкоду нашаму маладому пакаленьню.

Каму ня прыходзілася бачыць вечарамі, як каля кіно снуюць ва ўсе бакі дзеці і падросткі, якія вырваліся з дому, каб якім-небудзь спосабам прабрацца „зайцам" і паглядзець карціну, або можа нават і падзарабіць на білецік, перапрадаўшы яго каму-небудзь, хто не захапіў білета, каб у далейшым пасьці на другую карціну. Дзякуючы гэтаму каля кіно вечная штурхатня. Тут ты пачуеш і адборную лаянку і пабачыш, як практыкуецца моладзьдзю бокс і мордабойства, якімі багаты амэрыканскія кінофільмы і якія шкодна прышчапляюцца да маладое псыхікі юнака.

А ў часе дэманстраваньня карціны, хто ня чуў і ня бачыў, як падростак рэагуе на розныя любоўныя на розныя эратычныя моманты ў кіно-фільмах. Адзін раз мне прышлося чуць, як хлопчык, гадоў 5—6, якога прывяла ў кіно яго маці, запытаў у апошняе, калі ўбачыў, што на экране гэрой разыгрываў ролю гвалтаўніка: „мамка, што ён робіць"? Маці, ясна не магла яму нічога больш адказаць, як толькі тое, што „гэты дзядзя гадкі", але хлопчык увесь час дапытваўся —„што ён робіць"? і ня мог атрымаць належнага адказу. Адсюль ясна, што найлепш такіх малых дзяцей на падобныя фільмы не вадзіць. Але што-ж зробіш з тымі дзецьмі, у якіх няма бацькаўскага нагляду, або бацькі якіх ня зусім цікавяцца лёсам сваіх дзяцей. Гэтыя дзеці з папяросамі ў зубах бегаюць каля кіно, крычаць, б'юцца, лазяць па нагах у публікі, а часамі і практыкуюць залезьці ў чужую кішэню, каб „зарабіць" на білет у кіно ды на папяроскі. З гэтым зьявішчам трэба павесьці, каму належыць, змаганьне, трэба, каб кіно не зьяўлялася крыніцаю шкодных уплываў, а каб праз кіно падростак атрымаў здаровую жыўнасьць для свайго розуму і псыхікі.

Дзеля гэтага зусім не патрэбна забараняць дзецям наведваць кіно, патрэбна ў тэрміновым парадку ўзяцца за стварэньне дзіцячага кіно-рэпэртуару, таксама як і дзіцячых пастановак у нашых дзяржаўных тэатрах, каб было дзе юнаму глядачу правесьці разумна час, па вучыцца. У стварэньні дзіцячых кіно-фільмаў патрэбен удзел ня толькі кіно-працаўнікоў, але і пэдагогаў, пэдалёгаў і дактароў, якія больш ведаюць запатрабаваньні дзіцяці.

А пакуль што трэба некаму зьвярнуць увагу на тое, каб не рабіць кіно месцам усялякіх лаянак, штурхатні, боек ды іншае.

П. Ж.

Кнігі, атрыманыя для водзыву.

Выдавецтва Наркамгандлю СССР і РСФСР.

Правила заготовки кожсырья. Издание официальное. Москва, 1927 г. Стр. 47. Цена 25 коп.

А. Ф. Ломовисский. Курс коммерческих вычислений. М. 1927 г. Стр. 280. Цена 1 р. 85 к.

А. П. Рудановский. Построение государственного баланса. Под редакцией Б. А. Борьяна. М. 1928 г. Стр. 92. Цена 1 р. 25 к.

Справочник. Наркомторга СССР по металлам и металлоизделиям. М. 1928 года. Стр. 109. Цена 1 р. 35 коп.

Г. Ангерт. Справочник для покупателя трактора. М. 1928 г. Стр. 157. Цена 1. 65 коп.

Паведамленьні.

Нарада сакратароў ячэек КП(б)Б г. Менску.

У суботу, 14 студзеня, а 6 гадзіне ўвечары, у агітпрапгабінэце (клюб Карла Маркса) адбудзецца нарада сакратароў ячэек КП(б)Б г. Менску па пытаньні аб арганізацыі сэмінара сакратароў ячэек па пытаньнях партбудаўніцтва.

АПА Менакругкому КП(б)Б.

— У суботу, 14 студзеня г. г., а 6 гадзіне ўвечары, у клюбе глухаямых (Савецкая вул.) склікаецца раённая канфэрэнцыя МОПР'у Кастрычнікавага раёну.

Просьба да ўсіх ячэек МОПР'у выслаць сваіх дэлегатаў без спазьненьня.

Прэзыдыум Кастрычнікавага райкому МОПР'у.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

ТЭАТР. КІНО

Беларускі Другі Дзяржаўны тэатр. — Нядзеля, 15 студзеня **КАЛЯ ТЭРАСЫ** драма ў 4 дзеях, з часоў 1917 году. Пачатак а 8 з палов. гадзіне

Кіно-тэатр „Культура" — Першы бытавы баявік **„ВОДОВОРОТ"**. Звыш праграм: ХРОНІКА СОВКІНО № 108.

КІНО „Чырвоная Зорка". — ГРАНДЫЁЗНЫ АМЭРЫКАНСКІ БАЯВІК **„ВЕЧНАЯ БОРЬБА"**, частацк. драма ў 6 часьц. Штодзённа 4 сэансы. СКОРО! | VARIETE | СКОРО!

КІНО „ПРАЛЕТАРЫ". — **„СПАРТАК"** Штодзённа 4 сэансы: а 6, 7 з пал. 9 і 10 з пал. гадз. АНОНС! ЧАРГОВАЯ ПРАГРАМА „ВТОРАЯ ЖЕНА"

КІНО „Інтэрнацыянал". — ГРАНДЫЁЗНЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ. па аповесьці Лермантава «Герой нашего времени» **„БЭЛА"**, у 8 часьц.

ЛАТСЕКЦИЯ устраивает в субботу, 14 января, в доме